

Аперацыя «Ліпа»
СТАР. 4



Выстава з «Траццякоўкі»
СТАР. 13



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень
**20 КАНАЛАЎ**

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ВЕРАСНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 174 (28032) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Зашумеў зялёны «лес»

А як інакш назваць поле, на якім расце кукуруза вышынёй у тры з паловай метры? І не дзесьці на поўдні — у самым халодным рэгіёне краіны, ля вёскі Рудакі Віцебскага раёна. У мясцовым ААТ «Рудакова» «царыца палёў» займае паўтары тысячы гектараў. Вырошчваюць тут яе ў асноўным на сілас, сярэдняя ўраджайнасць складае 205 ц/га. Уборка цяпер ідзе поўным ходам, і ў галоўнага агранома гаспадаркі Дзяніса ЦЕРАШКОВА хапае клопатаў. Але ж і вынікам можна пахваліцца!



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар НАЗАРАНКА, старшыня дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі:**

*«Як вядома, у кастрычніку наша краіна прымае Генеральную асамблею Міжнароднай электратэхнічнай камісіі. Мерапрыемствы ўзроўню Генасамблеі МЭК праходзяць альбо ў краінах, якія зарэкамендавалі сябе як вельмі магутныя ў галіне электронікі, або ў краінах, якія вельмі зацікаўлены такімі стаць. Мы сябе адносім да краіны, якая вельмі зацікаўлена стаць адной з вядучых дзяржаў у галіне электронікі, электратэхнікі і іншых сумежных галінах. Пра свой удзел у пасяджэннях МЭК заявілі каля 100 экспертаў ад беларускай прамысловасці. Мы вельмі чакаем, што яны будуць актыўнымі. Дарэчы, у іншых краінах правядзеннем Генасамблеі МЭК займаліся арганізацыі па стандартызацыі, а ў нас гэтая работа атрымала вельмі сур'ёзную падтрымку і Прэзідэнта, і ўрада, якая вельмі сур'ёзна адчуваецца. На гэты момант у Беларусі па вялікім рахунку ўсё гатова».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17840,00 | ▲ |
| Еўра | 19959,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 260,36 | ▼ |
| Укр. грыўня | 824,02 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

ВЫБАРЫ 2015 11 кастрычніка

# КАНДЫДАТЫ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ

## З сённяшняга дня пачынаецца перыяд агітацыйнай кампаніі

**Учора Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэферэндумаў падчас свайго пасяджэння зарэгістравала чатырох кандыдатаў у прэзідэнты. Імі сталі Сяргей Гайдукевіч, Таццяна Караткевіч, Аляксандр Лукашэнка і Мікалай Улаховіч. Такім чынам, ужо сёння пачынаецца самы цікавы этап выбараў — агітацыя.**

Рашэнне аб рэгістрацыі было прынята, паколькі ўсе вышэйназваныя прэтэндэнты на вышэйшую дзяржаўную пасаду выканалі неабходныя патрабаванні для рэгістрацыі. Па-першае, па выніках праверкі падпісных лістоў кожны з іх мае больш за 100 тысяч подпісаў. Па-другое, гэтыя прэтэндэнты на пост кіраўніка дзяржавы падалі ў Цэнтральную камісію дэкларацыі аб даходах і маёмасці, як свае, так і поўнагадовых членаў сваёй сям'і. Цэнтрвыбаркам прызнаў дакументы карэктнымі або з нязначнымі памылкамі.

### АДРАС — НЕ ДОМ І НЕ ВУЛІЦА

Як ужо паведамлялася, для рэгістрацыі кандыдатамі ў прэзідэнты падалі дакументы шасцёра прэтэндэнтаў. Акрамя вышэйназваных, дакументы падавалі таксама Віктар Цярэшчанка і Жанна Раманоўская, аднак ЦВК адмовіў ім у рэгістрацыі. Абое не сабралі дастатковай колькасці подпісаў. Так, пераважная большасць подпісаў, пададзеных у тэрытарыяльныя камісіі ініцыятыўнымі групамі Віктара Цярэшчанкі, па выніках праверак прызнаны несапраўднымі. Як адзначылі ў сваіх дакладах старшыні абласных выбарчых камісій, амаль у кожным рэгіёне, дзе былі здадзены подпісы за гэтага кандыдата, тэрытарыяльныя камісія сутыкнуліся са шматлікімі парушэннямі.

Напрыклад, у Магілёўскай вобласці ў падпісныя лісты былі ўпісаны выбаршчыкі, якія «пражываюць» па неіснуючых адрасах. Члены тэрытарыяльных камісій спецыяльна выязджалі і засведчылі, што такіх дамоў увогуле не існуе. Таксама было шмат выпадкаў, калі ў падпісныя лісты былі ўпісаны прозвішчы людзей, якія ўжо даўно памерлі. У Брэсцкай вобласці падчас праверкі падпісных лістоў за гэтага кандыдата было выяўлена шмат подпісаў з «мінскімі» серыямі пашпартоў. Некаторыя падпісныя лісты аддаваліся на экспертызу, якая паказала, што яны падроблены пры дапамозе каляровага лазернага друку.

Па інфармацыі старшыні Магілёўскай абласной камісіі Валерыя Берастава, многія прадстаўнікі тэрытарыяльных камісій выявілі прыкметы «стаханаўскага» падыходу да збору подпісаў членамі ініцыятыўнай групы Віктара Цярэшчанкі. Так, здаваліся лісты, якія сведчылі пра тое, што нібыта за адзін дзень асобныя члены ініцыятыўнай групы маглі назбіраць больш за пяцьсот і нават семсот подпісаў — а гэта немагчыма тэхнічна, нават калі б гэты чалавек працаваў увесь дзень і ўсю ноч без перапынку.

СТАР. 2

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА СУСТРЭЎСЯ З ДАР'ЯЙ ДОМРАЧАВАЙ

**Прэзідэнт Беларусі ўчора сустрэўся з заслужаным майстрам спорту, трохразовай алімпійскай чэмпіёнкай па біятлоне, уладальніцай Вялікага хрустальнага глобуса ў сезоне 2014/2015, Героем Беларусі Дар'яй Домрачавай, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, як ідзе падрыхтоўка да біятлоннага фестывалю «Гонка легендаў — зоркі біятлону за мір», які адбудзецца ў суботу, 12 верасня, у Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па зімовых відах спорту «Раўбічы».

Дар'я Домрачава распавяла, што «Раўбічы» гатовыя прыняць як спартсменаў, так і аматараў гэтага віду спорту. «Думаю, усе нашы заўзятары заслужылі такое свята. Хочацца ўсё правесці душэўна для іх, паказаць усю сваю гасціннасць», — адзначыла біятланістка. Паводле яе слоў, гэты фестываль дапаможа выявіць і магчымыя слабыя месцы ў арганізацыі, што дазволіць у далейшым пры заяўках на правядзенне больш буйных турніраў не дапускаць праблемных сітуацый.

Аляксандр Лукашэнка і Дар'я Домрачава абмяняліся таксама думкамі пра стан спраў у нацыянальнай камандзе па біятлоне.

У час сустрэчы Дар'я Домрачава падарыла Прэзідэнту копію Вялікага хрустальнага глобуса.

## ЗА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЮ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ, ЛІТАРАТУРЫ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ №390 аб дзяржаўных узнагародах.**

Ордэна Францыска Скарыны ўдастоены прафесар кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага ўніверсітэта Аляксандр Баршчэўскі, а таксама паэт, перакладчык, публіцыст і грамадскі дзеяч Віктар Швед.

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны старшыня беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа» Ян Чыквін.

Яны ўдастоены ўзнагарод за актыўную дзейнасць па папулярызацыі беларускай культуры, мовы і літаратуры, значны асабісты ўклад у развіццё міжкультурных сувязяў і ўмацаванне добрасуседскіх адносін паміж Беларуссю і Польшчай.


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 14.10.2015 г. в 11.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот №1 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000036, г. Смолевичи, ул. И.Шамякина, 3<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000215, г. Смолевичи, ул. Шамякина, д. 34<br>Лот № 3 – площадь 0,1363 га, кадастровый номер 624850100002001209, г. Смолевичи, ул. Е.Полоцкой, д. 12 |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 130 000 000 рублей<br>Лот № 2 – 130 000 000 рублей<br>Лот № 3 – 130 000 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 –гравийная дорога<br>Лот № 2 – гравийная дорога<br>Лот № 3 – гравийная дорога |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «БеларусБанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002. (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком | Каждый четверг с 9.00 до 13.00 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | 09.10.2015 г. – 17.00 |

**Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.**

**Окончательный срок приема заявлений – 04.09.2015 г. 17.00.**

**Контактные телефоны: (8-01776) 5-52-65, (8-01776) 5-53-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).


# КАНДЫДАТЫ ЗАРЭГІСТРАВАНЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У выніку колькасць сапраўдных подпісаў за Віктара Цярэшчанку склала менш за сем тысяч, і ЦВК адмовіў яму ў рэгістрацыі кандыдатам у прэзідэнты.

Ініцыятыўная група Жанны Раманоўскай сабрала менш за 800 подпісаў. Адпаведна, яна таксама не можа прагрэваць удзельнічаць у выбарчай кампаніі як прэтэндэнтка на пост прэзідэнта.




Фота БЕЛТА.

### АГІТАЦЫЯ АБЯЦАЕ БЫЦЬ ЦІКАВАЙ

Пасля рэгістрацыі кожны з прысутных кандыдатаў у прэзідэнты выступіў з невялікай прамовай.

Як падкрэсліла ў сваёй прамове Тацццяна Караткевіч, яна ўдзячна сваёй камандзе і тым людзям, якія аддалі свае подпісы ў яе падтрымку.

Сяргей Гайдукевіч таксама падзякаваў усім, хто аддаў за яго подпіс.

— Падчас збору подпісаў я бачыў, што за мяне гатова прагаласаваць вялікая колькасць людзей у нашай краіне, — заявіў ён.

Мікалай Улаховіч у сваім выступленні прызнаўся, што лічыць сябе добрым гаспадарам і знаёмы з эканомікай не па кнігах.

Пасля таго, як кандыдатам у прэзідэнты былі зарэгістраваны дзейны кіраўнік дзяржавы, з невялікай прамовай выступіў кіраўнік яго ініцыятыўнай групы Міхаіл Орда, які прадстаўляў інтарэсы Аляксандра Лукашэнкі па натарыяльна заверанай даверанасці. Міхаіл Орда адзначыў: ініцыятыўная група пры зборы подпісаў убачыла, што людзі на месцах ставяцца да выбараў неабыякава і разумеюць, што вырашаецца лёс краіны. Таксама ён падкрэсліў, што грамадства аказала беспрэцэдэнтную падтрымку дзейнаму Прэзідэнту Беларусі.

Пазней Лідзія Ярмошына, адказваючы на пытанне журналістаў, наколькі цікавай будзе цяперашняя агітацыйная кампанія, заўважыла, што пра гэта лепш пацікавіцца ў саміх кандыдатаў.

— Мне здаецца, сёння на пасяджэнні яны выступілі дастойна, паказалі сябе цікава, — адзначыла старшыня Цэнтральнай камісіі. — Цалкам магчыма, што агітацыйная кампанія таксама будзе цікавай.

Адказваючы на пытанне, ці прызнае АБСЕ гэтыя выбары, Лідзія Ярмошына падкрэсліла, што «мы заўсёды працуем на прызнанне».

— Але гэта залежыць, перш за ўсё, ад саміх краін Захаду і ад АБСЕ, — заявіла яна.

### УЗОР БЮЛЕТЭНЯЎ ЗАЦВЕРДЖАНЫ

Падчас учарашняга пасяджэння Цэнтрвыбаркам зацвердзіў форму і колькасць бюлетэняў для галасавання. Тэкст іх будзе на беларускай мове, прозвішчы кандыдатаў размесцяць у алфавітным парадку. Пасля гэтых радкоў будзе графа «Супраць усіх кандыдатаў». Усяго ў планах аддрукаваць 7 мільёнаў 285 тысяч бюлетэняў. Колькасць запасных бюлетэняў складзе 4,5% ад агульнай. Бюлетэні для галасавання за мяжой будуць друкаваць самі дыпмісіі.

— Па нашым заканадаўстве выбарчыя бюлетэні павінны быць выдадзены ва ўчастковыя выбарчыя камісіі не пазней як за дзень да датэрміновага галасавання — значыць, не раней чым у панядзелак 5 кастрычніка, — паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама. — На той момант мы ўжо будзем валодаць дакладнымі звесткамі аб колькасці выбаршчыкаў.

### ДАВЕРАНЫХ АСОБ — НЕ БОЛЬШ ЗА 30

Учора таксама былі зарэгістраваны 30 даверанных асоб Аляксандра Лукашэнкі і яго фінансавы прадстаўнік. Таксама ЦВК зарэгістраваў па 28 даверанных асоб Тацццяны Караткевіч і Сяргея Гайдукевіча. Пры гэтым у камандзе апошняга з'явіўся і афіцыйны фінансавы прадстаўнік. Тацццяна Караткевіч пакуль не падала дакументы на рэгістрацыю свайго фінансавага прадстаўніка. Пры гэтым усе каманды яшчэ маюць права папрасіць ЦВК зарэгістраваць даверанных асоб і фінансавых прадстаўнікоў.

Як удакладніла Лідзія Ярмошына, ліміт колькасці даверанных асоб — 30. Прычым кандыдаты маюць права рабіць замены.

### САЧЫЦЕ ЗА ЭФІРАМ

Падчас пасяджэння Цэнтрвыбаркама было праведзена лёсаванне, якое вызначыла, хто і калі будзе выступаць па тэлебачанні і радыё. Нагадаем, у адпаведнасці з выбарчым заканадаўствам кандыдатам у прэзідэнты Беларусі прадастаўлена магчымасць выступіць на бясплатнай аснове на тэлебачанні (у эфіры тэлеканала «Беларусь 1») і радыё (у эфіры Першага нацыянальнага канала беларускага радыё) па два разы. Працягласць кожнага выступлення абмежавана 30 хвілінамі. Па тэлебачанні ўсе выступленні будуць транслявацца ў 19.30 — найбольш рэйтынгавы час.

Першыя выступленні кандыдатаў у прэзідэнты пачнуцца ўжо на наступным тыдні і пройдуць з аўторка па пятніцу — 15, 16, 17 і 18 верасня. Праз тыдзень кандыдаты ў прэзідэнты змогуць выступіць яшчэ раз — 22, 23, 24 і 25 верасня. Для выступлення на радыё адводзіцца час у ранішнія гадзіны — з 6.10 да 7.10. Першыя выступленні па радыё выйдуць у эфір 23 і 25 верасня. Права на наступныя выступленні кандыдаты ў прэзідэнты змогуць рэалізаваць 30 верасня і 2 кастрычніка.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

# ПРАФСАЮЗЫ ВЫСТУПІЛІ З ЗАЯВАЙ

**Учора адбыўся II пленум Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, які сабраў прадстаўнікоў ФПБ з усіх абласцей рэспублікі. Яго галоўным пытаннямі сталі выкананне рашэння VII з'езда федэрацыі і прыняцце заявы ў сувязі з выбарамі Прэзідэнта Беларусі, якія адбудуцца 11 кастрычніка.**

«Выбары — гэта заўсёды вызначэнне далейшага лёсу дзяржавы. Мы разам адказваем за ўмацаванне і развіццё нашай краіны. Сёння на пленуме Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі мы прынялі заяву, у якой гаворыцца, што сацыяльныя гарантыі, абарона правоў працоўных, мірнае і спакойнае жыццё на беларускай зямлі наўпрост залежаць ад кіраўніка дзяржавы», — пракаментаваў журналістам змест выніковага дакумента старшыня Федэрацыі Міхаіл Орда.

Ён таксама адзначыў, што выбарчы працэс у Беларусі пераходзіць да наступнага важнага этапу — агітацыі. «Цяпер галоўнае — выконваць выбарчае заканадаўства. Кампанія па зборы подпісаў за кандыдатаў на пасаду Прэзідэнта паказала, што заўваг ад праваабаронцаў і міжнародных назіральнікаў не было. Усё было ў рамках закона. Думаю, што і далей усё будзе адбывацца гэтак жа добра», — рэзюмаваў прафсаюзны лідар.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

# ГАЛОЎНАЯ ТЭМА ФОРУМУ РЭГІЁНАЎ — ПРАМЫСЛОВАСЦЬ

**Удзел у Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі пацвердзілі 58 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, што амаль утрая больш, чым летась. Пра гэта паведаміў падчас прэс-канферэнцыі Анатоль РУСЕЦКІ, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. «З беларускага боку будуць удзельнічаць усе вобласці, у тым ліку Мінск», — дадаў ён.**

— Першы Форум рэгіёнаў адбыўся ў мінулым годзе ў Мінску, — нагадаў сенатар. — Удзел у ім узялі 19 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі і ўсе вобласці Беларусі. Тады быў прыняты выніковы дакумент, які тычыцца аграпрамысловай палітыкі. Ён паказаў даволі высокую эфектыўнасць.

Па словах віцэ-спікера верхняй палаты беларускага парламента, рэгіянальныя сувязі паміж аграрыямі — як у межах Саюзнай дзяржавы, так і Еўразійскага эканамічнага саюза — значна ўмацаваліся. Чакаецца, што той жа самы эфект мерапрыемства будзе мець і сёлета, толькі ўжо ў плане прамысловай палітыкі, якая з'яўляецца «цвіком» сёлетняга форуму.

«Плануецца падпісанне больш як ста сумесных кантрактаў», — паведаміў парламентарый. Іх папярэдняя агульная сума складзе болей за 100 мільёнаў долараў. Беларускім урадам падрыхтавана для падпісання з рэгіёнамі 6 пагадненняў і яшчэ 19 — непасрэдна паміж самімі рэгіёнамі.

Праўда, не ўсе прадпрыемствы змаглі прадставіць свой тавар на выстаўцы, паўдзельнічаць у бізнес-сустрэчах з дзелавымі коламі Расіі. «Мы не рабілі акцэнт на ўсім вядомых брэндах накшталт «Бабулін гладыш» ці «Санта-Брэмар», — сказаў **Вячаслаў ДРАГУН, намеснік міністра гандлю Рэспублікі Беларусь.** — Аблвыканкамы аддалі перавагу малавядомым у Расіі беларускім вытворцам».

Падрыхтоўка да форуму завершана, і праца ідзе ўжо на выставачнай пляцоўцы ў Сочы. «Туды выехалі нашы менеджары», — дадаў **Вячаслаў БРЫЛЬ, намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.** Па яго словах, у выстаўцы возьмуць удзел 97 беларускіх арганізацый.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

## МЕСЯЦ БЕЗ ІНФЛЯЦЫІ — ТОЛЬКІ 0,2%

**Такім чынам, індэкс спажывецкіх цэн у Беларусі на тавары і паслугі ў жніўні ў параўнанні з ліпенем склаў 100,2%, а ў параўнанні са снежнем мінулага года — 107,8%, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт.**

Атрымліваецца, што цэннікі ў жніўні засталіся практычна некранутымі. Базавы індэкс спажывецкіх цэн, які выключае змяненне цэн на асобныя тавары і паслугі, што рэгулююцца дзяржавай, а таксама на тавары сезоннага характару, у жніўні ў параўнанні з ліпенем склаў 100,8%. А вось харчовыя тавары ў жніўні нават патаннелі на 0,8% у параўнанні з ліпенем. Праўда, за гэты час цэны на нехарчовыя тавары павялічыліся на 1%. Крыху мацней змяніўся за мінулы месяц індэкс цэн і тарыфаў на платныя паслугі, які ў жніўні склаў 101,1%.

**Сяргей ПАЛІНІН.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНОВ
по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества
**Организатор аукционов: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.**

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 53-32-96

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 19,9 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 597 000 бел. руб. **Размер задатка:** 59 000 бел. руб.

Лот №2. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 35,9 кв.м (в т.ч. 5,5; 19,4; 11 кв.м), расположенных на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 1 077 000 бел. руб. **Размер задатка:** 107 000 бел. руб.

Лот №3. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 15,6 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 468 000 бел. руб. **Размер задатка:** 46 000 бел. руб.

Лот №4. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 51,7 кв.м (в т.ч. 4,1; 14,3; 13,2; 20,1 кв.м), расположенных на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 1 551 000 бел. руб. **Размер задатка:** 155 000 бел. руб.

Лот №5. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 40,0 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 1 200 000 бел. руб. **Размер задатка:** 120 000 бел. руб.

Лот №6. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 18,7 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 561 000 бел. руб. **Размер задатка:** 56 000 бел. руб.

Лот №7. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 19,3 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 579 000 бел. руб. **Размер задатка:** 57 000 бел. руб.

Лот №8. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 19,5 кв.м, расположенного на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52236 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А (административное здание). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 2,5. **Начальная цена:** 585 000 бел. руб. **Размер задатка:** 58 000 бел. руб.

Лот №9. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 19,7 кв.м (в т.ч. 6,3; 13,4 кв.м), расположенных на 2-м этаже капитального строения с инв. №200/С-53951 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленина, 52 (отделение связи №26). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 591 000 бел. руб. **Размер задатка:** 59 000 бел. руб.

Лот №10. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 74,4 кв.м (в т.ч. 22,6; 13,1; 29,1; 9,6 кв.м), расположенных на 1-м этаже капитального строения с инв. №200/С-52241 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 84А/3 (здание административное). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 2 232 000 бел. руб. **Размер задатка:** 223 000 бел. руб.

Лот №11. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 30,1 кв.м (в т.ч. 11,6; 13,5; 5 кв.м), расположенных на 2-м этаже изолированного помещения с инв. №200/D-107228 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Чкалова, 34, пом.1 (отделение связи №32). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 903 000 бел. руб. **Размер задатка:** 90 000 бел. руб.

**Целевое использование:** для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). **Дата, время и место проведения аукциона:** 15.10.2015 в 14.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 11.09.2015 с 8.30. по 14.10.2015 до 17.30

**Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 53-32-96

Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещений общей площадью 21,36 кв.м (в т.ч. 13,73; 7,63 кв.м), расположенных на 1 этаже капитального строения с инв. №240/С-29422 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Флерова, д. 6А (здание отделения почтовой связи – 9). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена:** 640 800 бел. руб. **Размер задатка:** 64 000 бел. руб.

**Целевое использование:** для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). **Дата, время и место проведения аукциона:** 16.10.2015 в 14.00 по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 11.09.2015 с 8.30 по 15.10.2015 до 17.30

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, г. Витебск, ул. Ленина, 17, УНП 390477566. **Контактный тел.: (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.**

■ Надвор'е

# КРЫХУ ДОЖДЖЫКУ, АЛЕ ЦЁПЛА

**Пасля непагадзі з частымі дажджамі і невысокімі тэмпературамі ў другой палове тыдня пагода палепшылася, а на выхадныя, пад уплывам скандынаўскага антыцыклону, будзе ўвогуле амаль сонечна, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Непасрэдна ў пятніцу гаспадарыць на тэрыторыі Беларусі будзе антыцыклон з цэнтрам над Фінскім залівам. Таму сёння ападкаў увогуле не прагназуецца. Чакаюцца сапраўды камфортныя ўмовы, калі максімальная тэмпература паветра складзе плюс 14-20 градусаў.

У суботу антыцыклон перамесціцца на цэнтральныя раёны Расіі, але ўплыў яго на наша надвор'е яшчэ захаваецца. Будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па паўднёвым захадзе краіны застанецца верагоднасць невялікіх кароткачасовых дажджоў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Цяпер уначы стане крыху цяплей, калі тэмпература паветра складзе 4-10 цяпла, а па паўднёвым захадзе месцамі — да плюс 12 градусаў. Удзень цудоўныя 14-19 цяпла.

Больш вільготныя паветраныя масы завітаюць да нас у нядзелю. Аднак кароткачасовыя дажджы чакаюцца толькі ў асобных раёнах краіны. Традыцыйна ўначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 4-11 градусаў, месцамі — да 13 цяпла, удзень прагназуецца плюс 13-18 градусаў, аднак па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца яшчэ да 20 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак надвор'е ў Беларусі будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску і больш цёплыя паветраныя масы, якія паступаюць з паўднёвага захаду Еўропы. Нават крыўдна, бо менавіта ў працоўны дзень усталюецца проста цудоўнае надвор'е, калі ўначы па паўночным усходзе магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы, а ўдзень будзе пераважна без ападкаў. Ізноў туман уначы і раніцай. Тэмпература паветра ўначы складзе 4-11 цяпла, а ўдзень да нас амаль завітае лета. Будзе плюс 14-21 градус, а па паўднёвым захадзе паветра прагрэецца да 23 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# Стаць ратаўніком яшчэ ў школе

## XVIII РЭСПУБЛІКАНСКІ ЗЛЁТ ЮНЫХ РАТАЎНІКОЎ-ПАЖАРНЫХ АДКРЫЎСЯ Ў ЛАГЕРЫ АДПАЧЫНКУ «ЗУБРАНЯ»

**Крыху больш за дзвесце юнакоў і дзяўчат з усёй Беларусі сабралася ў Нарачанскім краі. Яны пакажуць валоданне ўменнямі, дзякуючы якім у крытычных сітуацыях можна ўратаваць не адно чалавечае жыццё.**

— Юныя пажарныя-ратаўнікі прадстаўляюць восем каманд — па адной з кожнай вобласці, сталіцу і ліцэй пры Гомельскім інжынерным інстытуце, — гаворыць **міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір ВАШЧАНКА.** — Нам важна, што яны ведаюць, як працаваць у надзвычайнай сітуацыі, не будуць абыякавыя да чужога гора. Яны пастаянна прапагандуюць бяспечны лад жыцця, вучаць яму і дапамагаюць сваякам, сябрам і незнаёмым людзям.

Праграма злёту насычаная. Падлеткаў чакаюць конкурсы па аказанні першай медыцынскай дапамогі, правільным ратаванні на вадзе. Самымі яркімі спаборніцтвамі абяцаюць стаць зводныя палявыя вучэнні, дзе юныя ратаўнікі пакажуць на практыцы ўсе атрыманыя веды з конкурсаў і майстар-класаў, якія праводзяць спецыялісты Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння і Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

— Калі гэты рух толькі зараджаўся, вельмі востра стаяла праблема гібелі дзяцей на пажарах, — расказвае **памочнік міністра па надзвычайных сітуацыях Віталь НАВІЦКІ.** — Як на іх правільна сябе весці, не ведалі ні дзеці, ні бацькі. І лічбы загінулых малых былі жудаснымі: агонь забіраў тады да 50 дзіцячых жыццяў за год, сотні атрымлівалі траўмы, моцныя апёкі... Вось менавіта дзякуючы такім формам і ўдаецца нам упływаць на бягучае аператыўнае становішча. І ўжо сёлета толькі восем дзетак сталі ахвярамі полымя...

Але разам з тым нельга гаварыць, што ўсе гэтыя падлеткі пойдуць працаваць ратаўнікамі. Неяк у міністэрстве падлічылі, колькі ж удзельнікаў з сямнаццаці папярэдніх злётаў здолелі паступіць у навучальныя структуры. Атрымалася прыкладна каля двухсот.





— Я ўжо ў чацвёрты раз на злёце, — расказвае **адзінаццацікласнік з 50-й гімназіі Мінска Павел КАНАШ.** — За гэты час цалкам вывучыў асновы бяспекі жыццядзейнасці, ды не ў тэорыі, а на практыцы. У прыватнасці, нас вучылі, як выратаваць чалавека на вадзе, аказаць першую медыцынскую дапамогу... А тут мы, апроч іншага, заводзім новыя знаёмствы і дзелімся вопытам. Куды буду паступаць пасля школы, яшчэ не вызначыўся. Я не выключаю і Камандна-інжынерны інстытут...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*





Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Асцярожна!

# НЕ ДЛЯ СТАЛА

## Дзяржстандарт у гандлёвай сетцы Гомеля выявіў небяспечныя рыбныя кансервы

**Гомельская абласная інспекцыя Дзяржстандарта выявіла рыбныя кансервы «Печань траскі натуральная Т.М. «Рыбоведовъ», якія не адпавядалі патрабаванням ДАСТ 13272-2009 «Кансервы з печані рыб. Тэхнічныя ўмовы». Выраблена гэтая прадукцыя прадпрыемствам «Сампо» (Мурманск) па замове таварыства з абмежаванай адказнасцю «Корса» (Калінінград). Імпарцёрам у нашай рэспубліцы з'яўляецца прадпрыемства «Формула МК» (Мінск).**

Так, у выніку лабараторных выпрабаванняў у прадукце былі выяўлены нежыццяздольныя палавасплелыя гельмінты, скручаныя ў спіралі, і іх лічынкавыя стадыі. Знойдзены таксама і стужкавы чарвяк (Cestoda), памер якога склаў 9 см. Пры гэтым ступень паражэння гельмінтамі склала 68%.

— Печань траскі таксама не прайшла тэст і па іншых арганалептычных паказчыках: наяўнасць старонняга паху акісленага тлушчу, нераўнамерны колер кавалкаў печані, а таксама неўласцівы колер выдзеленага тлушчу, — адзначылі ў прэсслужбе Дзяржстандарта.

Па выніках наглядных мерапрыемстваў Дзяржстандарт выдаў арганізацыям «Еўрагандаль» і «Формула МК» прадпісанні аб забароне ўвозу і абароту на тэрыторыі рэспублікі гэтых рыбных кансерваў і адмене на іх дэкларацыі аб адпаведнасці.

У аддзеле дзяржаўнага нагляду і кантролю Дзяржстандарта паведамілі, што па выніках праверак харчовай прадукцыі ў 2015 годзе імпартныя рыбныя кансервы ўвайшлі ў лік найбольш праблемных груп. Абласнымі інспекцыямі ўстанаўліваліся неадназоавыя неадпаведнасці гэтай прадукцыі патрабаванням дзейных на яе стандартаў па якасных характарыстыках, а таксама па масе асноўнага прадукту ва ўпакоўцы. У гэтай сувязі Дзяржстандарт рэкамендуе імпарцёрам займаць патрабавальную пазіцыю ў дачыненні да закупкі прадукцыі, пры заключэнні дагавораў і кантрактаў прадугледжваць яе адпаведнасць дзейным тэхнічным нарматыўным прававым актам: на рынак рэспублікі павінны паступаць толькі бяспечныя і якасныя тавары.

**Дар'я ШОЦІК**

■ Незвычайнае побач

# АПЕРАЦЫЯ «ЛІПА»

**Падчас камандзіроўкі ў глыбінку карэспандэнту «Звязды» расказалі пра старую ліпу, якой гадоў 300. Дзіўна, што яна пры гэтым не ахоўваецца дзяржавай. Людзі турбаваліся, што лясную прыгажуню могуць выпадкова знішчыць або наўмысна спілаваць. Журналіст запрасіў прыехаць да ліпы эколага. Апошні, у сваю чаргу, узяў у кампанію супрацоўніка ўніверсітэта. А на месца нас адвёз неабыякавы жыхар Віцебска. Такім чынам атрымалася невялічкая экалагічная экспедыцыя.**



Вакол ствала.

Пра старое дрэва даведаўся ад жыхароў Віцебскага раёна:

— Я такіх вялікіх ніколі не бачыла. Нават не ўсе жыхары Гары — нашага паселішча радавых маёнткаў — пра гэтую прыгажуню ведаюць. Ліпа расце недалёка ад вёскі Рыбакі, якая знаходзіцца на беразе Заходняй Дзвіны. Шкада будзе, калі яе спілуюць. А не дай Божа, дрэва апынецца пад вадой? Недалёка ж будуецца гідраэлектрастанцыя. Побач з ліпай нехта выкопваў пясок. Недалёка хтосьці выкінуў корпус ад старога тэлевізара... Як жа можна так не цаніць прыгажосць, не шанаваць яе, не берагчы? — перажывае Ала Мішурная.

Зацікавіўся, і мы паехалі да дрэва. Жанчына здалёку яшчэ ў машыне паказала верхавіну вялікай ліпы. Вышынёй яна, не памылюся, калі напішу, што пад дзевяціпавярховы дом. Расце каля лясной дарогі, недалёка ад ліпы невялікая нізіна. Відаць, што тут здабывалі пясок. Ці мелі адпаведны дазвол? А яшчэ буралом перашкаджаў дайсці да дрэва. Трое дарослых і квартэт дзятвы, узяўшыся за рукі, не без цяжкасцяў абхапілі ствол... Побач з ліпай ніякай ахоўнай таблічкі. Няўжо лёс старога дрэва нікога, акрамя жыхароў Гары, не хвалюе?

У абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя я адразу знайшоў паразуменне. І праз некалькі дзён — зноў падарожжа да дрэва.

**С录валам гадоў 200, а мо і больш. Каб дакладна вызначыць узрост, трэба арганізаваць даследаванне.**

— Як былы работнік лясной гаспадаркі, магу сказаць, што гэта ліпа драбналістая. І складаецца з чатырох ствалоў парасткавага паходжання. Калісьці было спілавана дрэва, і ад старога пня, калі сказаць па-навуковаму, адбылося парасткавае аднаўленне. У выніку да нашага часу захаваліся толькі чатыры парасткавыя ствалы. Магло захавацца і больш. Наўскідку магу сказаць, што ствалам гадоў 200, а мо і больш. Каб дакладна вызначыць узрост, трэба арганізаваць даследаванне. Гэта можна зрабіць у рамках выканання мерапрыемстваў Схемы рацыянальнага размяшчэння асабліва ахоўных прыродных тэрыторый Віцебскай вобласці на 2014—2023 гады. Дакумент зацверджаны абласным Саветам дэпутатаў. Абследаванне тэрыторыі Віцебскага раёна, дзе і знаходзіцца ліпа, прадугледжваецца ў 2016—2017 гадах. Аналагічнае робіцца і ў іншых раёнах вобласці пры выяўленні патэнцыйных асабліва ахоўных прыродных тэрыторый. Пасля даследавання, і калі будзе прынята адпаведнае рашэнне, ліпу «замацуюць» за адказным за зямлю... А ініцыятыву людзей, якія так клапоцяцца аб прыродзе, можна толькі вітаць. Больш бы такіх неабыякавых, для якіх ахова прыроды — не проста заклік! Старую ліпу можна будзе ўдала «ўпісаць» у экалагічны маршрут. Калі, вядома, такі будзе стварацца (пры наяўнасці канкрэтнай цікавай інфармацыі ці іншых цікавых аб'ектаў), — пракаментаваў на месцы **Васіль КІРПІЧОНАК, намеснік начальніка аддзела дзяржкантролю за аховай і выкарыстаннем зямельнага, раслiннага і жывёльнага свету, нетраў, асабліва ахоўных прыродных тэрыторый і абыходжаннем з адходамі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

У выніку потым можна будзе праводзіць экскурсіі, арганізоўваць практычныя заняткі для юных эколагаў і студэнтаў.



**Афіцыйныя асобы і мясцовыя жыхары абмяркоўваюць, што рабіць, каб захаваць ліпу.**

Асабліва цікава адшукаць гістарычныя звесткі. Мо тут спыняўся Напалеон? А мо мясцовы пан у гонар важнай падзеі ў яго жыцці пасадзіў ліпу? Жыхары Гары сцвярджаюць, што яна расце ў наваколлі былога Яшкінага фальварка і аднайменнага возера...

Тое, што ліпа можа ўяўляць інтарэс, пацвердзіў супрацоўнік ВНУ.

**Трое дарослых і квартэт дзятвы, узяўшыся за рукі, не без цяжкасцяў абхапілі ствол... Побач з ліпай ніякай ахоўнай таблічкі. Няўжо лёс старога дрэва нікога, акрамя жыхароў Гары, не хвалюе?**

— Дрэва ў добрым стане захавалася да нашых дзён. Толькі адно маленькае дупло глыбінёй з далонь. А на старых ліпах звычайна яны вялікія... У ліку іншага яна цікавая і для селекцыйнай працы. Гэта ж выдатны генафонд, знаходка для леснікоў! Безумоўна, атрымаўшы адпаведны заказ, фінансаванне, мы гатовыя ўзяцца за вывучэнне гэтай ліпы. Наконт яе мінулага... Раскажу калегу па ўніверсітэце, вядомаму краязнаўцу Мікалаю Півавару. Ён даследаваў мноства розных аб'ектаў: дрэў, таго, што засталося ад забудоў, і іншага. Спадар Півавар зрабіў пры гэтым шмат адкрыццяў. Буду рады паведаміць чытачам «Звязды» пра тое, што будзе зроблена, — распавядае **Леанард МЕРЖВІНСКІ, загадчык кафедры батанікі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.**

«Звязда» будзе сачыць за працягам гісторыі. Пагадзіцеся, паважаныя чытачы, усё, што тычыцца нашага мінулага, уяўляе цікавасць. Мо тая ліпа — маўклівая сведка важных гістарычных падзей? Безумоўна, яна можа стаць знакавым месцам для тых, каму цікава больш даведацца пра Беларусь.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Віцебскі раён — Віцебск.*


**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживания многоквартирного дома в г. Смолевичи, ул. Зеленая**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 14.10.2015 г. в 11.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот №1 – площадь 0,3878 га, кадастровый номер 624850100001000927, г. Смолевичи, ул. Зеленая |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания многоквартирного жилого дома |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 800 000 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 – электроснабжение, газоснабжение, водоснабжение, централизованное водоотведение |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «Беларусбанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002. (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком | Каждый четверг с 9.00 до 13.00 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | 09.10.2015 г. – 17.00 |

**Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.**

**Окончательный срок приема заявлений – 04.09.2015 г. 17.00.**

**Контактные телефоны: (8-01776) 5-52-65, (8-01776) 5-53-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

**ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА на право заключения договоров аренды земельного участка для строительства и обслуживания производственной базы в г. Смолевичи**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 14.10.2015 г. в 11.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот №1 – площадь 0,9000 га, кадастровый номер 624800000001002568 Смолевичский район (г. Смолевичи) Минская область |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания производственной базы |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 800 000 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республике Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь;<br>В) наличие не менее двух участников |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 – имеется водоснабжение и электроснабжение |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной стартовой цены на р/с 3641000000205 ЦБУ 621 филиала № 616 АСБ «БеларусБанк», г. Жодино, код 812 УНП 600014139 ОКПУ 04064735, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |
| 12 | Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком | Каждый четверг с 9.00 до 13.00 |
| 13 | Окончательный срок приема заявлений | 09.10.2015 г. – 17.00 |

**Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 14.**

**Окончательный срок приема заявлений – 04.09.2015 г. 17.00.**

**Контактные телефоны: (8-01776) 5-52-65, (8-01776) 5-53-42.**

**Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

**Гомельский городской филиал РУП «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» объявляет о проведении процедуры переговоров на выполнение строительно-монтажных работ по объекту строительства**

**«Текущий ремонт облицовочного покрытия фасада вестибюля административного здания, расположенного в г. Гомеле по ул. Полесская, 19Б, с заменой дверной коробки».**

**Переговоры состоятся 16 сентября 2015 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Полесская, 19Б, каб. 2-4 (2-й эт.).**

Дополнительную информацию и документацию для переговоров можно получить по адресу: г. Гомель, ул. Полесская, 19Б, каб. 2-7, каб. 2-5. Контактные телефоны: 71-08-02, 71-08-00, факс 71-08-01.

УНП 401147651

**ВНИМАНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «СПМК № 127»**

ОАО «СПМК №127» сообщает о покупке акций собственного выпуска по требованию акционеров в связи с реорганизацией ОАО «СПМК №127» на следующих условиях:

**Цена** – 45 (сорок пять) белорусских рублей за 1 акцию. В цену не включен удерживаемый при покупке подоходный налог.

**Срок оплаты** – в течение 3 рабочих дней с даты поступления акций на счет «депо» ОАО «СПМК №127».

**Форма оплаты** – оплата производится путем выплаты наличных денежных средств по расходному кассовому ордеру в белорусских рублях или путем перечисления на расчетный счет продавца.

**Срок подачи предложения о продаже** – с 11.09.2015 по 14.09.2015 (включительно).

**Начало и окончание покупки акций** – с 15.09.2015 по 15.10.2015.

**Адрес для подачи предложений о покупке** – г. Минск, ул. Инженерная, 22, каб. 210.

УНП 100048018



TV@R

## Таццяна ПЕСНЯКЕВІЧ:

# «ФАЛЬКЛОР — ТАЯ КРЫНІЦА, ШТО НІКОЛІ НЕ ПЕРАСОХНЕ»

**Голас музыказнаўца, аўтара, вядучай праграм «Падарунак меламану», «Сустрэча з песняй», «Галасы стагоддзяў» на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё і перадач «Майстар-клас», «Гасцінец» на радыё «Культура» Таццяны Песнякевіч знаёмы, думаю, не аднаму пакаленню слухачоў. З любоўю да музыкі і да слухача — так можна ахарактарызаваць яе падыход да ўжо шматгадовай працы на радыё. Але Таццяна прызнаецца, што і дагэтуль не адчувае стомленасці. Мы вырашылі сустрэцца з вядучай, каб пагаварыць пра тое, як складваліся яе ўзаемаадносіны з музыкай, чаму важна маўчаць і з чаго варта пачынаць вывучаць нашу гісторыю.**

— Мая зацікаўленасць музыкай пачала праяўляцца яшчэ ў дзяцінстве. Мама некалі расказвала, як яна, бывала, везла мяне дадому з дзіцячага садка. На вуліцах тады стаялі рэпрадуктары і звычайна ў той час трансліраваліся вячэрнія маскоўскія музычныя праграмы. Гучала класічная музыка, песні добрых выканаўцаў. І я пыталася ў маці: «Скажы, чый гэта голас гучыць — Лемешава ці Казлоўскага?» Здаралася, да істэрыкі даходзіла, калі не атрымлівала адказу. Усё пачалося з радыё. Яно ж тады гучала ва ўсіх дамах на працягу дня. Вечарам слухала казку на ноч, а днём, калі прыходзіла са школы, гучалі цікавыя праграмы, трансляцыі з Вялікага тэатра, канцэрты беларускай акадэмічнай музыкі... І разам з тым з дзяцінства выступала на ранішніках у дзіцячым садку, потым пачалася вучоба — музычная школа, музычнае вучылішча, кансерваторыя. І там зноў — радыё.

***— А як пачалі працаваць на радыё?***

— Я заканчвала кансерваторыю, і паўставала пытанне: куды мне размеркавацца? Тады я ўжо мела 9-месячнага сына, была замужам. Бацькі майго мужа сябравалі з сям'ёй фальклярыста Генадзя Цітовіча. Звярнуліся да яго па параду: можа, ведае, дзе патрабуюцца маладыя спецыялісты. А ён сябраваў з музычнай рэдакцыяй Беларускага радыё. Там мяне і парэкамендаваў.

***— Як асвойваліся на працы?***

— Усё спазнавала ў працэсе. Падчас вучобы ў кансерваторыі (я заканчвала «Музыказнаўства») у нас была рэдактарская практыка. Помню, пісалі нешта для «Вячэрняга Мінска» і на тэлебачанні знаёміліся з працэсам. А вось з радыё сутыкацца не даводзілася. Прыйшла ў аддзел беларускай музыкі: пачала вывучаць картатэку, унікаць у працэс запісу праграм... Потым трэба было браць інтэрв'ю ў дзеячаў мастацтва. І неяк само склалася, што пачала займацца фальклорнай праграмай. Спачатку гэта быў радыёклуб «Фальклор», потым «Галасы стагоддзяў», а зараз працягам гэтай тэматыкі можна лічыць існуючую праграму «Гасцінец» на радыё «Культура». Такой была база. На яе з часам «нанізаліся» руская і замежная класіка, беларуская акадэмічная музыка і многае іншае...

***— А прыход у перадачу «Сустрэчы з песняй», аўтарам якой вы зараз з'яўляецеся, калі адбыўся?***

— У праграме мяняліся аўтарскія калектывы, і неяк мне сказалі, што трэба гэтую працу «падхапіць». Так я ўзялася рабіць перадачу «Сустрэчы з песняй». З часам зразумела: яе аўдыторыя — людзі сталага веку, у кожнага з іх свой лёс і настальгія па былых часах, пачуццях, успамінах. У лістах, якія яны дасылалі і дасылаюць на перадачу, усё гэта адлюстроўваецца. Успамінаюць вайну, школьных сяброў, першае каханне. Часам гісторыі нават цяжка чытаць, бо чалавек дзеліцца сваім патаемным. У наш час наогул рэдкасць — гаварыць настолькі шчыра і адкрыта, давяраць радыё.



***— А вы сваё першае каханне памятаеце?***

— Гэта мой муж, з якім мы знаёмы ўжо сорак гадоў. З першага класа разам. З пятага класа нават за аднoй партай сядзелі. Потым я сышла ў музычнае вучылішча, а ён пасля заканчэння школы паступіў ва ўніверсітэт. Сёння муж кандыдат біялагічных навук. Аднак жыццё ўсё ж звяло нас разам. Я думаю, што гэты чалавек пасланы мне Богам: кажуць жа, лёс распісаны на нябёсах. І таму пашчасціць, хто адкрые старонку, якая прызначана менавіта для яго.

***— Па сутнасці, вы людзі супрацьлеглых інтарэсаў. На чым жа трымаюцца такія саюзы?***

— Муж у мяне чалавек вельмі вытрыманы і з неверагодным пачуццём гумару. У яго шырокае кола інтарэсаў. Гэта нас звязвае. Мы глядзім у адным напрамку. Напрыклад, ён з задавальненнем можа пайсці са мной на канцэрт. А мне заўсёды цікава даведацца яго меркаванне пасля праслухоўвання твораў як чалавека з іншай прафесійнай сферы. Я вельмі цаню непасрэднае ўспрыманне музыкі.

***— Распрацоўваючы план новых выпускаў «Сустрэчы з песняй», ад чаго вы адштурхоўваецеся?***

— Тут я арыентуюся выключна на песні, якія згадваюць слухачы. Чытаю лісты і музыкальны матэрыял дае канву для пабудовы праграмы.

**— Ёсць у вас яшчэ не менш цікавая праграма «Гасцінец»...**

— Я думаю, яна з'яўляецца працягам фальклорнай экспедыцыі, якая была распачата ў перадачы «Галасы стагоддзяў». Праўда, цяпер мы робім акцэнт больш на выканаўцаў і носьбітаў фальклору. У экспедыцыі ўжо не выязджаем, а карыстаемся назапашаным музычным матэрыялам.

**— Выязджаючы ў фальклорныя вандроўкі, вы заўважалі, што ў глыбінцы людзі зусім іншыя?**

— Яны іначай успрымаюць жыццё. Рухаюцца ў сваім тэмпе. Неяк мы былі ў камандзіроўцы ў лістападзе. А пасля запісу праграмы выйшлі на вуліцу, і там выпаў першы снег, свеціць поўня... Я гляджу на гэтую прыгажосць і пачынаю ўзгадваць усе нашы размовы, што толькі адбыліся, песні, якія пачулі. І разумею: там час цячэ па-іншаму, людзі спыняюцца, каб убачыць неба. А мы ў горадзе ўсё некуды спяшаемся, бяжым, вочы апушчаны. Таму такія сустрэчы якраз вучаць збаўляць тэмп і атрымліваць задавальненне ад таго, што ёсць.

**— Калі сёння паглядзець на пласт песеннай культуры, дзе аснову складае фальклор, то што там адбываецца, якая перспектыва?**

— Традыцыі працягваюцца і захоўваюцца. Мы маем багаты матэрыял, ёсць калектывы, якія зберагаюць гэтую спадчыну. І я думаю, што тая крыніца ніколі не перасохне. Зразумела, нешта страчваецца, сыходзіць, з'яўляецца новае. У нас вялікую працу і з добрымі вынікамі праводзіць кафедра этналогіі і фальклору Універсітэта культуры. Там ужо не першы год рыхтуюць спецыялістаў, якія вывучаюць спецыфіку народных спеваў. І я ведаю, што гэтыя людзі працуюць, ствараючы потым свае калектывы, каб падтрымліваць тое, што мы маем. Веру, што фальклорная спадчына будзе захоўвацца, хоць жыццё і змяніла ўмовы існавання гэтага мастацтва і іх ролю. Калі раней кожны крок «прапяваўся», то цяпер усё іначай. У той жа Еўропе аўтэнтыку мы сустрэнем ужо нячаста.

**— Вы неяк дзяліліся ўражаннямі пра тое, што ў Балгарыі і Румыніі існуюць кругласутачныя тэлеканалы, прысвечаныя фальклору. Можа, варта было б і нам пераймаць такі вопыт?**

— Калі б нешта такога кшталту было ў нас, то думаю, з'явіўся б і інтарэс да гэтага. Ты ўключаеш тэлеканал, а там сабрана і аўтэнтыка, і розныя другасныя формы фальклору (самадзейныя калектывы, апрацоўкі для эстрады і г.д.) і здымаюць усё ў розным антуражы. Цікава глядзець! Увесь час гучыць музыка, і ты бачыш краіну праз прызму гэтага мастацтва. У нас жа гэтую тэму, хоць і не абмінаюць, але было б добра больш акцэнтаваць на ёй увагу. Тады, можа, і лепш, і больш разумелі б людзі, якое гэта багацце. Прагучыць банальна, быццам без мінулага няма будучыні, але ў гэтым сапраўды глыбокі сэнс. У фальклоры столькі ўсяго закладзена: слова спалучаецца з музыкай і з абрадам — гэта цэлы космас. Калі б мы з дзяцінства пачыналі яго вывучаць, то чалавек усведамляў бы: тут мая зямля, гісторыя, якая пачынаецца з гісторыі сям'і. Фальклярыст Галіна Барташэвіч расказвала, напрыклад, што, здаецца, у Даніі ўрокі ў малодшых класах пачынаюцца з выканання народнай песні. Цікава было б такі вопыт пераняць.



**— Скажыце, а вам удаецца слухаць музыку, не аналізуючы яе?**

— Заўсёды імкнуся ўспрымаць музыку як звычайны слухач. Нават пратэстую супраць яе «анатамічнага» даследавання, бо для мяне яна найперш эмацыйнае мастацтва... Мая музыка — гэта імпрэсіяністы, Клод Дэбюсі... Я, наогул, па характары слухач, а не апавядальнік. У жыцці мы шмат гаворым і так мала знаходзім часу памаўчаць. А ў маўчанні душа набывае вопыт. Мабыць, тым і прываблівае мяне праца на радыё, што тут вучышся асцярожна ставіцца да слова.

**Алена ДРАПКО.**
*drapko@zviazda.by*

# З ПЕРШЫМ ЭФІРАМ!

## Магілёў стартаваў на тэлеканале «Беларусь 4»

**Ініцыятыва Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі па стварэнні рэгіянальнага тэлеканала «Беларусь 4», дзе будуць вяшчаць усе абласныя тэлецэнтры, была падтрымана Міністэрствам інфармацыі — і вось першы вынік. У Міжнародны дзень салідарнасці журналістаў пачаў вяшчанне тэлеканал «Беларусь 4. Магілёў». А палове сёмай раніцы прагучаў нацыянальны гімн, пасля якога ў прамы эфір выйшла перадача «Ранехонько».**

— З'явілася магутная пляцоўка для паляпшэння інфармавання насельніцтва Магілёўшчыны, — адзначыў **старшыня «Белтэлерадыёкампаніі» Генадзь ДАВЫДЗЬКА.** — Рэгіянальнае тэлебачанне павінна гаварыць на тыя тэмы і адлюстроўваць тыя праблемы, якія хвалююць людзей на месцах.

Усяго ў вяшчальнай сетцы новага тэлеканала звыш 20 праектаў уласнай вытворчасці. Для самых маленькіх на «Беларусь 4. Магілёў» будзе ісці вячэрняя казка з дэманстрацыяй дзіцячых малюнкаў, дасланых у студыю. Жыхарам вобласці прадстаўіцца магчымасць не толькі пачуць мясцовыя навіны, але і прагноз надвор'я непасрэдна таго раёна, дзе яны жывуць. Абяцае стаць папулярнай праграма «Дзённы часопіс», дзе ў якасці суразмоўцаў выступяць кампетэнтныя спецыялісты ў розных галінах. У гледачоў будзе магчымасць патэлефанаваць у студыю і пачуць адказ на сваё пытанне ў прамым эфіры. Акрамя таго, «Беларусь 4. Магілёў» плануе паказаць з паветра ўсе райцэнтры вобласці, іх асноўныя архітэктурныя і прыродныя славутасці. У перспектыве — тэлевізійныя трансляцыі тэатральных пастановак, важных масавых мерапрыемстваў.

— Варта адзначыць, што ў нас ёсць добры вопыт працы, — адзначыла **кіраўнік «Тэлерадыёкампаніі «Магілёў» Ірына АКУЛОВІЧ.** — У кастрычніку 1997 года ў эфір выйшаў тэлеканал «Магілёў 1» з аб'ёмам вяшчання 14 гадзін у суткі. Ён існаваў 6 гадоў. Але потым працяглы час мы вяшчалі на тэлеканале «Беларусь 2» невялікімі адрэзкамі часу раніцай і ўвечары і па замове канала «Беларусь 1» распаўсюджвалі свой кантэнт на ўсю краіну. Цяпер у нас з'явілася добрая магчымасць выходзіць у эфір з раніцы і да позняга вечара.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



60-гадовы юбілей адзначае ў гэтыя дні першы намеснік старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь А.П. Саламаха. Калектыў «Звязды» шчыра віншуе паважанага Аляксандра Пятровіча і жадае далейшых поспехаў у жыцці!

# СЕРАДА, 16 ВЕРАСНЯ

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.35** Зона Х.
**9.10, 22.00 Серыял «След».**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 20.00 Серыял «Цікаўная Варвара 3».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**13.10** Дзень у вялікім горадзе.
**14.05 Серыял «Дзявочае паляванне».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.25 Дэтэктыў «Выходжу цябе шукаць 2». Заключная серыя.**
**17.40** Беларуская часінка.
**19.30** Выступленні кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.15** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.05** «Арол і рэшка». Трэвел-шоу.
**10.00** «Разбуральнікі міфаў».
**11.00** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.30** Беларуская кухня.
**12.30, 17.55 Дэтэктыў «Сустрэчная плынь». Заключная серыя.**
**13.25, 0.55 Серыял «Косці».**
**14.20, 19.05 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».**
**17.00, 1.40** «Пін-код».
**20.55** Цела чалавека.
**21.35** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Першы тур. «Баер» — БАТЭ.
**23.45** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Кваліфікацыя. Агляд гульнявога дня.

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранак».
**7.50, 11.30, 13.55, 18.50, 0.50** «Калейдаскоп».
**8.00, 19.00 «Канвой PQ 17». Драма.**
**9.45, 17.05 «Кутузаў». Драма.**
**11.40 «Падмененая каралева». Фільм-казка.**
**12.45** М/ф.
**13.25, 0.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта і музыканта Адама Русака.
**14.05, 21.30 «Ад'ютант яго правасхадзіцельства». Маст. фільм.**
**16.35** «У гасцях у Барыса Аверына». Яўген Грышкавец, пісьменнік, драматург.
**20.45** «Калыханка».
**21.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**23.55** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 7.30, 23.50** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Козел пра футбол.
**7.45** Спорт-кадр.
**8.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Першы тур. Агляд гульнявога дня.
**9.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Першы тур. «Манчэстэр Сіці» — «Ювентус».
**11.05** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Мінск).
**12.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Манчэстэр Сіці».
**14.45** Змяшаныя адзінаборствы. ММА. М-1 Global.
**16.50** Грэка-рымская барацьба. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**18.55** Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Дынама» (Мінск).
**21.10** Футбол. На шляху да ЧС-2018. Відэачасопіс.
**21.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Першы тур. Анлайн гульнявога дня.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!»
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.05, 16.20** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!»
**18.20 Серыял «ЗАГС».**



**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Лепш не бывае».**
**23.05 Маст. фільм «Адчайная хатняя гаспадыня».**
**0.50** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Новыя Рабінзоны».**
**10.15** «Далёкія сваякі».
**10.40 «Салдаты 9». Серыял.**
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!»
**13.50** «Ежа багоў».
**14.45, 23.20 «Меч». Серыял. Заключная серыя.**
**15.35, 0.10 «Водбліскі». Серыял.**
**16.50** «Мінск і мінчане».
**17.35** «Званая вячэра».
**18.35** «Тайны нашай планеты»: «Эпоха перамен. Вадалей надыходзіць».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Фантастыка «Парадокс».**
**21.55** «Глядзець усім!»
**23.00** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**1.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30, 1.10 Маст. фільм «Змяіная крыніца».**
**11.15 Маст. фільм «Здзіві мяне».**
**13.00, 16.00, 19.00, 22.05, 23.10** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 2.55** Дак. серыял «Давайце разбярэмся!»
**14.15 Серыял «Мужчына ўва мне».**
**16.20, 5.25** Дак. серыял «Іншы свет».
**16.50** Дак. серыял «Зямля. Тэрыторыя загадак».
**17.20 Серыял «Маўклівы сведка».**
**19.25 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».**
**22.15** Ток-шоу «Слова за слова».
**23.25 Маст. фільм «Рыта».**
**3.50 Маст. фільм «Вясёлая моладзь».**

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Пакой смеху».
**12.30 Камедыя «Тры дні ў Маскве».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**15.30** «Прамы эфір».
**17.30 Серыял «Тайны следства».**
**19.10, 20.55 Серыял «Скліфасоўскі».**
**22.00, 23.10 Серыял «Чужая мілая».**
**23.50** «Спецыяльны карэспандэнт».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**7.10, 8.05 Серыял «Ляснік».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**9.05** «Раніца з Юліяй Высоцкай».
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.40** «Справа густу».
**15.10** «Лаліта».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**17.55** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «Шэф. Новае жыццё».**
**21.20 Серыял «Люты».**
**23.10** «Анатомія дня».
**23.40 Серыял «Знакі лёсу-2».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.00, 23.40** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.45 Серыял «Горад мары».**
**8.35, 9.55, 12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.15, 19.25, 20.55** «Хатняя крама».
**8.40, 18.20 Серыял «Я чую голас твой».**
**9.45** «Кінаблакнот».
**10.00** Дак. серыял «Тайны прыроды».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак.
**11.00 Драма «Анёл-захавальнік».**
**13.00 Серыял «Флэш».**
**14.10 Серыял «Лавізна».**
**16.20** «Золата маўчання».
**16.45 Серыял «За межамі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05 Баявік «Шпіён, які мяне кахаў».**
**23.15 Серыял «Байкі са склепа».**

## ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.00** М/ф «Смяшарыкі».
**7.30, 14.30, 4.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**8.00, 17.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 18.00, 23.30** Серыял «Анжаліка».
**10.00, 19.00** Серыял «Месяц».
**11.00** Камедыя «Прыгажуні».
**12.50** «Ералаш».
**13.30, 20.00** Серыял «Апошні з Магікян».
**15.00, 3.00** Рэаліці-шоу «Ты нам падыходзіш».
**16.00, 1.00** Серыял «Навіны».
**17.00, 4.30** «Лаві момант».
**21.10** Камедыя «Прышэльцы».
**23.05, 5.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.30, 5.30** «Дурні і дарогі».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Наглядальнік».
**11.15, 21.55** «Сага пра Фарсайтаў». Серыял.
**12.10** «Красуй, горад Пятроў!» «Гатчынскі парк і Прыярацкі палац».
**12.40, 20.40** «Правілы жыцця».
**13.10** Да 2000-годдзя горада Дзербента. «Расія, любоў мая!»
**13.40, 23.50** «Браты Карамазавы». Маст. фільм.
**14.50** «Томас Алва Эдысан». Дак. фільм.
**15.10** Пісьменнікі нашага дзяцінства. «Валянцін Берастаў. Быць дарослым вельмі проста...».
**15.40** Штучны адбор.
**16.20, 22.45** «Хто мы?» «Першая сусветная».
**16.50** «Астравы». Мераб Мамардашвілі.
**17.35** XV Міжнародны конкурс імя П.І. Чайкоўскага. Лаўрэаты і прызёры. Сольны спеў.
**18.40** «Франчэска Петрарка». Дак. фільм.
**18.45** «Закахацца ў Арктыку». Дак. серыял.
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Галоўная роля.
**20.00** «Абсалютны слых».
**21.10** Улада факта. «Пра вытокі Русі».
**23.10** «Сусветныя скарбы культуры».
**23.45** Мастсавет.
**1.00** «Пацешкі» без пацехаў». Нацыянальны акадэмічны аркестр народных інструментаў Расіі імя Н. Осіпава.

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Аўтограф». 2005 год.
**7.00** Маст. фільм «За твой лёс».
**8.20, 9.40, 11.00, 12.55, 14.35, 15.40, 17.25, 18.50, 20.15, 21.40, 23.25, 0.45, 2.00, 2.55, 5.20** Музычная настальгія.
**8.50** М/ф «Казка пра прагнасць».
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. Арыстарх Ліванаў. 2008 год.
**13.10** Маст. фільм «Як маладыя мы былі».
**14.50** М/ф «Казка пра белую ільдзінку».
**17.00, 23.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... тэлевізійныя мемуары». Леанід Уцёсаў. 1-я частка.
**18.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Вячаслаў Малежык. 2008 год.
**19.10** Маст. фільм «Начны матацыкліст».
**20.45** М/ф «Дзіўнае кіцяня».
**0.00** «Акулы пяра». Ліка. 1995 год.
**1.30** Маст. фільм «Комэск».
**2.40** М/с «Прыгоды Рэкса».
**4.00** Маст. фільм «Кветкі лугавыя».

## EUROSPORT

**4.00, 8.00, 19.30** Снукер. Шанхай Мастэрс.
**6.00, 13.30, 18.30** Тэніс. Турнір Вялікага шлема. US Open. Лепшыя моманты.
**7.00, 14.45, 20.30, 1.30** Веласпорт. Вуэльта. Лепшыя моманты.
**12.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя WTCC.
**13.00** Аўтаспорт. Сусветная серыя Рэно.
**14.30** Watts!
**15.45, 21.30** Веласпорт. Гран-пры Валоніі.
**18.00, 1.00** Спорт знутры. Новазеландскае рэгбі.
**23.00** Усе віды спорту.
**23.05** Госці Лючыі.
**23.10** Конны спорт. Клуб коннікаў.
**23.15** Гольф. U.S. P.G.A. тур.
**0.30** Гольф. Гольф-клуб.
**0.35** Кубак Солхейма.
**0.40** Парусны спорт. Яхт-клуб.
**2.30** Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.

## КАМЕДЫЯ

**6.00** Прафілактыка на тэлеканале.
**10.00, 17.45, 22.00, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**10.45** Меладрама «Нявеста з таго свету».
**12.25** Камедыя «Нешта падобнае на шчасце».
**14.00, 14.45, 15.25** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.10, 20.00, 22.50, 0.50, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Даю год».
**18.30** Камедыя «Неўпапад».
**20.20** Камедыя «Таксі-2».
**23.10** Камедыя «Джым з Пікадзілі».
**1.15** Камедыя «Вясельная вечарынка».
**4.00** Меладрама «Каханне без перасадак».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.25** «Доктар І...».
**7.55, 19.00, 1.15** «Забароненае каханне». Серыял.
**9.25, 3.05** «Судовыя страсці». Дак. серыял.
**10.15, 3.50** «Па справах няпоўнагадовых». Дак. серыял.
**11.10** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**12.05** «Сакрэты экстрасэнсаў». Дак. серыял.
**13.00, 18.00** «Тайны следства». Серыял.
**14.00, 2.40** «Простыя складанасці».
**14.30, 22.50** «Зорныя гісторыі».
**15.25, 5.30** «Нераскрытыя тайны».
**16.00** «Шчырая гутарка».
**17.00, 21.50** «Мар'ін гай». Серыял.
**20.50, 0.30** «Дарога на востраў Пасхі». Серыял.
**23.45** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

## ТБ1000

**6.00** Трылер «Сотавы».
**7.35** Меладрама «Парыж — Манхэтэн».
**8.50** Камедыя «Міс Кангеніяльнасць ІІ: выдатная і небяспечная».
**10.50** Баявік «Прывідны гоншчык».
**12.50** Камедыя «Кошкі-мышкі».
**14.45** Трылер «Добры немец».
**16.30** Драма «Марыя-Антуанета».
**18.30** Прыгоды «Падарожжа да Цэнтра Зямлі».
**20.00** Камедыя «Кухар на колах».
**22.00** Трагікамедыя «Два дні ў Парыжы».
**23.40** Камедыя «Два дні ў Нью-Ёрку».
**1.00** Драма «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
**4.00** Камедыя «Настаўнік англійскай».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Меладрама «Кароткія сустрэчы».
**8.10** Прыгоды «Прыватнае піянерскае».
**10.05** Драма «Гутарка».
**11.30** Камедыя «Аб чым маўчаць дзяўчыны».
**13.00** Трагікамедыя «Самотная жанчына жадае пазнаёміцца».
**14.40** Драма «Каляфутбола».
**16.20** Драма «Дуброўскі».
**18.40** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**20.20** Драма «Дыялогі».
**22.00** Камедыя «Заяц над безданню».
**23.40** Баявік «22 хвіліны».
**1.10** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**2.40** Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога».
**4.50** Фантастыка «Падзямелле ведзьмаў».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 8.00, 11.50** Гульні розуму.
**7.15, 9.20, 13.30, 19.20** Навуковыя недарэчнасці.
**7.40** Код небяспекі.
**8.40** Узлом сістэмы.
**10.00, 14.20, 20.10** Папулярная навука.
**11.00** Мегазаводы.
**12.40, 16.50, 21.00, 1.10, 4.30** Шаша праз пекла.
**15.10** Дзікія жывёлы Поўначы.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.40, 21.50, 2.00, 5.15** Ледзяная дарога.
**18.30** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**22.40, 2.50** 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
**23.30, 3.40** Расследаванні авіякатастроф.
**0.20** Эвакуацыя Зямлі.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Што было далей?
**9.40, 13.50** Калекцыянеры аўто.
**12.10** Скарбы з кладоўкі.
**13.00, 1.00, 7.10** Неверагодныя басейны.
**14.40, 6.25** Навука магіі.
**16.20, 5.35** Мяцежны гараж.
**17.10, 3.00** Махінатары.
**18.00, 23.00** Паляўнічыя на рэліквіі.
**22.10** Склады.
**0.00** Іржавая імперыя.
**2.00** Top Gear.
**4.00** Маланкавыя катастрофы.
**4.25** Сапраўдныя аферысты.
**4.50** Экстрэмальныя калекцыянеры.

## Гараскоп на

**АВЕН.** Вы схільны прытрымлівацца пастаўленай задачы, ніколі не зварочваць і пераадольваць любыя перашкоды. Вас будуць перапаўняць новыя ідэі і жаданне абавязкова іх рэалізаваць. Час таксама спрыяльны для рамантычных знаёмстваў. Казаць пра сур'ёзнасць такіх адносін пакуль яшчэ заўчасна. Магчыма ўзнікненне цяжкасцей на працы і ў вырашэнні якіх-небудзь дзелавых пытанняў. Да канца тыдня лепш завяршыць справы і не пераносіць клопаты на наступны тыдзень.

**ЦЯЛЕЦ.** Пачатак тыдня атрымаецца цяжкім. Вы захочаце вырашыць усе справы, каб потым спакойна адпачыць. Нягледзячы на ўсе вашы намаганні, хутка справіцца са штодзённай руцінай не ўдасца. Але не варта адчайвацца, у другой палове тыдня вы ўсё ж зможаце ўздыхнуць спакойна і прысвяціць сябе любімаму занятку. Намячаецца паляпшэнне фінансавага становішча. Асабліва актыўным будзе канец тыдня, калі ў вас адкрыецца новая крыніца энергіі і струмень жаданняў і імкненняў знойдзе свой выхад.

**БЛІЗНЯТЫ.** У жыцці імкліва ўварвецца нешта новае. Гэта можа быць і новае пачуццё, і новы від дзейнасці. Але незалежна ад таго, як вонкава будзе аформлена гэтая навіна, яна прывядзе да стабілізацыі становішча, паляпшэння атмасферы вакол вас. На гэтым тыдні вы знойдзеце спакой і гармонію, зможаце наладзіць адносіны са сваякамі, паправіць сваё фінансавае становішча. Парады, атрыманыя на гэтым тыдні, могуць быць важнымі, і калі не прыслухаецеся да чужога меркавання, то далейшае ваша падарожжа можа прайсці ў адзіноце.

**РАК.** Працяглая барацьба за лепшае месца пад сонцам можа змарыць каго заўгодна, а тым больш такую чуллівую натуру. Але вы ўсё роўна не здаяцеся на шляху пабудовы свайго шчасця, якім бы вы яго ні бачылі. А на гэтым тыдні вы будзеце бачыць яго ў вельмі канкрэтных вобразах, вамі можа авалодаць моцнае жаданне ўлады, страсці і грошай. Бываюць моманты, калі менавіта такіх рэчаў нам не хапае для поўнага шчасця, і ў гэтым няма нічога дрэннага, галоўнае не захапляцца і не перабраць, каб ні ператварыцца ў раба матэрыяльнага свету. Заслужаны адпачынак і спакой прыйдуць толькі напрыканцы тыдня.

**ЛЕЎ.** У вашым жыцці паступова пачынаюць адбывацца перамены. У першую чаргу гэта тычыцца вашага ўнутранага свету. На дадзеным этапе сітуацыя выглядае некалькі негатыўна для вас, асабліва ў сферы ўзаемаадносін з іншымі людзьмі. Тут магчымы канфлікты, рознагалоссі і супрацьстаянні. Таму аптымальным будзе звесці да мінімуму знешнія кантакты. Зірніце на свет па-новаму. Ваша пастаянная барацьба з усімі, адстойванне сваіх пазіцый і поглядаў і разам з гэтым руплівая праца, каб прыйсці да чагосьці лепшага, не прыносяць ніякага выніку. Каб вырвацца з замкнёнага кола, не трэба паскараць бег, трэба спыніцца і дазволіць жыццю вывесці вас на новы ўзровень.

**ДЗЕВА.** Вы вельмі спяшаецеся ў сваім жыцці, у вас шмат задач, неабходна ўсё паспець, а пры гэтым часу не так шмат. Вядома, можна паскараць бег, можна прыцягнуць на дапамогу іншых людзей, часам схітраваць, гэтым палепшыўшы сваё становішча. Але нельга заўсёды вытрымліваць дадзены рытм і выкарыстоўваць іншых людзей. Рана ці позна вы вычарпаеце рэсурсы і наступіць стадыя разбурэння, краху ўсяго ўзведзенага. Не спрабуйце даць рады ўсяму, вызначыцеся з галоўным — і тады вам хопіць сіл на шчаслівае жыццё.

## СУБОТА, 19 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**7.25** Існасць.
**7.50 Меладрама «Ты будзеш маёй».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.40, 23.25 Серыял «Два бацькі і два сыны».**
**10.45** «50 рэцэптаў першага».
**11.20** Дача.
**12.10** «Здароўе». Ток-шоу.
**12.50** «Terra incognita». Беларусь невядомая.
**13.25** Выхад ёсць.
**14.00, 0.30 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30** Зроблена ў Беларусі.
**15.50 Меладрама «Адзінокія сэрцы». 1-я серыя.**
**17.30 Меладрама «Русалка».**
**21.00** Панарама.
**21.40 Меладрама «Праверка на каханне».**
**0.20** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.05** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц» (Італія).
**7.35** Навуковае шоу прафесара Адкрывашкіна.
**8.00 Серыял «Мая цудоўная нянька».**
**10.05** Азбука густу.
**10.40, 21.05** Тэлебарометр.
**10.45** «Бітва экстрасэнсаў. Трэцяя сусветная».
**12.45** Капейка ў капейку.
**13.20** Вось гэта дзіва!
**13.55, 23.10 Серыял «Бафі — знішчальніца вампіраў».**
**16.15** Анімацыйны фільм «Сцюарт Літл».
**17.45** «Арол і рэшка. Шопінг». Стайл-шоу.
**18.45 Камедыя «Дрэнныя хлопцы».**
**21.10 Баявік «Турыст».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНА.

### БЕЛАРУСЬ 3

**8.00, 13.35, 18.00, 0.05** «Калейдаскоп».
**8.10, 16.40 «Жаніх з Маямі». Камедыя.**
**9.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**10.00 «Зімовая раніца». Драма.**
**11.25** «Антысволачы». Дак. фільм.
**12.05 «Порах». Драма.**
**13.45** «Камертон». Рэжысёр-дакументаліст, паэт, перакладчык, аўтар і выканаўца песень Іржы Вондрак.
**14.10 «Тварам да сцяны». Дэтэктыў.**
**15.50** «Запаведнымі сцежкамі беларускай зямлі». Дак. фільм.
**18.10 «Вяртанне рэзідэнта». Дэтэктыў.**
**20.20** Вандроўка з «Бясёдай». Гомельская вобласць.
**20.45** «Калыханка».
**21.05 «Лэдзі і разбойнік». Меладрама.**
**22.35** «Вечар добрага настрою». Арт-трыа «Вольніца» і Аляксандр Борматаў.
**23.25** «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Ігар Перальыгін.

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 7.30, 0.10** PRO спорт. Навіны.
**7.15** Спорт-мікс.
**7.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Першы тур. Агляд гульнявога дня.
**8.40** Хакей. КХЛ. «Лакаматыў» (Яраслаўль) — «Дынама» (Мінск).
**10.35** Вольная барацьба. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**12.55** Хакей. Белнафтахім — чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Металург» (Жлобін).
**15.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Чэлсі» — «Арсенал».
**16.55** Піт-стоп.
**17.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**17.55** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. Першы тур. БГК імя Мяшкова — «Вайводзіна» (Сербія).
**19.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Сіці» — «Вест Хэм».
**21.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суёнсі» — «Эвертан».
**23.20** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».
**9.25** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10 Меладрама «Службовы раман».**
**14.00 Серыял «Ліст чакання».**
**16.15, 21.00** Навіны спорту.
**16.20** Ералаш.
**16.30** «Інструкцыі не прыкладаюцца».
**18.40** «ДОстояние РЕспублики: Міхаіл Баярскі».
**21.05** Канцэрт «Мы разам. Гомельская вобласць».
**23.20** «Сёння ўвечары».
**0.50 Фантастыка «Драпежнікі».**

### СТБ

**6.25 Маст. фільм «Іду шукаць».**



**7.55** «Анфас».
**8.10** «Тайны свету».
**9.05** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**10.00** «Іншая краіна». «Грузінскі акцэнт».
**10.35** «Далёкія сваякі».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.40 «Салдаты 5». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40, 0.15 Маст. фільм «Пігмаліён».**
**15.25** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.35 Камедыя «Смяротная зброя».**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10 Маст. фільм «Загадана знішчыць».**
**22.30** «Дакументальны праект»: «Мясная планета. Рыбны Сусвет».
**1.55** «Маска. Дзень і ноч».

### МІР

**6.00, 8.40** М/ф.
**6.15 Маст. фільм «Волга-Волга».**
**8.10** «Саюзнікі».
**9.30** «Ой, мамачкі».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».
**10.45 Маст. фільм «Дзеці Дон-Кіхота».**
**12.15** М/ф «Тайна трэцяй планеты».
**13.05 Маст. фільм «Генрых Наварскі».**
**16.15 Серыял «Маша ў законе».**
**20.50 Маст. фільм «Дом».**
**23.15 Маст. фільм «На шляху!».**
**1.10** «Культпрасвет».
**1.55** «Дыяспары».
**2.25 Серыял «Бездань: ведзьмін круг».**
**4.40 Маст. фільм «Маё каханне».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Маст. фільм «Генеральская нявестка».**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.15** «Танкавы біятлон».
**12.15 Маст. фільм «З жыцця начальніка крымінальнага вышуку».**
**14.15 Маст. фільм «Прабачыць за ўсё».**
**16.00** «Маё жыццё зроблена ў Расіі».
**16.35 Маст. фільм «Хатняя гаспадыня».**
**18.15** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40 Маст. фільм «Важкае пачуццё».**
**22.25 Маст. фільм «Халодная страва».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.05, 8.20 Серыял «Курортная паліцыя».**
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Іх норавы».
**9.25** «Справа густу».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.00** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худзею!»
**14.15, 16.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**18.05** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.05** «Новыя рускія сенсацыі».
**21.00** «Ты не паверыш!»
**22.00** «50 адценняў. Бялова».
**23.00 Дэтэктыў «За межамі закона».**
**0.40** «Як на духу».

### 8 КАНАЛ

**9.00, 13.40, 19.00, 20.55, 23.40** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.30 Серыял «Сутыкненне светаў».**
**10.35, 11.50, 15.55, 17.20** «Хатняя крама».
**10.50** «Хобі+TV».
**11.40** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**12.05 Камедыя «Смурфікі».**
**13.45 Камедыя «Пастка».**
**15.35** Мультпарад.
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Альф».**
**17.30 Серыял «Агент Картэр».**
**19.05 Камедыя «Стралец непрыкаяны».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.10 Драма «Гнеў».**

### ВТБ

**6.00** «PLAY».
**7.00, 0.30, 4.00** «Лаві момант».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**7.45** М/ф «Маша і Мядзведзь».
**8.00** «Ералаш».
**9.00** Серыял «Вароніны».
**10.00, 1.00** «Турбаміксер».
**12.00** Трылер «Мішэль Вальян: прага хуткасці».
**14.10, 23.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30** «Хатняя кухня».
**15.00, 5.00** Серыял «Сваты».
**17.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**17.30** «Уральскія пельмені».
**19.00** Серыял «Два бацькі і два сыны».
**20.30** Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».
**23.30** «Без вежы».
**3.30** Скетч-шоу «Валера-ТБ».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35** «Мы з вамі недзе сустракаліся». Маст. фільм.
**12.10** Вялікая сям'я. Аляксандра Якаўлева.
**13.05** Да 100-годдзю пачатку Першай сусветнай вайны. «Нефрантавыя нататкі». Дак. серыял.
**13.35** «Відавочнае-неверагоднае». Канстанцін Цыялкоўскі.
**14.45** «Містэр Ікс». Маст. фільм.
**16.20** Да 2000-годдзя горада Дзербента. «Дагестан. Старажытныя вароты Каўказа». Дак. фільм.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Рамантыка рамакса».
**18.25** «Іван Грозны». Маст. фільм.
**21.20** «Гора розуму, ці Эйзенштэйн і Меерхольд: двайны партрэт у інтэр'еры эпохі». Дак. фільм.
**22.20** Кіно на ўсе часы. «Вечнае ззянне чыстага розуму». Маст. фільм.
**0.10** «Жыццё пінгвінаў». Дак. фільм.
**1.00** Джэкі Тэрасан на джазавым фестывалі ў Сэнт-Эмільёне.
**1.50** «Заяц, які любіў даваць парады». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Колькі каштавала Аляска?»
**2.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Спяем, сябры!» з Таццянай Візбар. Рыгор Гладкоў. 2007 год.
**7.00** Маст. фільм «Дні лётныя».
**8.20, 9.40, 11.00, 12.55, 14.35, 15.40, 17.00, 19.00, 20.45, 23.25, 0.45, 2.15, 3.40, 5.20** Музычная настальгія.
**8.50** М/ф «Страшны, шэры, кудлаты».
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**12.00, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1978. Паўтор ад 2008 года.
**13.15** Маст. фільм «Пароль ведалі двое».
**14.50** М/ф «Што на што падобна».
**16.00** «Колба часу».
**19.20** Дак. фільм «Вельмі вас усіх люблю».
**21.00** «Быў час». 2009 год.
**22.00** Маст. фільм «Гракі».



**0.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. Вячаслаў Малежык. 2008 год.
**1.10** Маст. фільм «Начны матацыкліст».
**2.45** М/ф «Дзіўнае кіцяня».
**5.00** «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... тэлевізійныя мемуары». Леанід Уцёсаў. 2-я частка.

### EUROSPORT

**4.00, 8.00, 18.00** Снукер. Шанхай Мастэрс.
**7.00, 20.00** Спідвей. Чэмпіянат Еўропы.
**12.00** Watts!
**12.30** Веласпорт. Вуэльта. Лепшыя моманты.
**13.30** Веласпорт. Гран-пры Валоніі.
**15.00** Вяслярны слалам. Чэмпіянат свету.
**16.15** Веласпорт. Мемарыял Марка Пантані.
**23.00, 0.15** Конны спорт. Клуб коннікаў.
**23.05** Конны спорт. Global champions tour.
**0.30** Аўтаспорт. Сусветная серыя WTCC.
**1.00** Аўтагонкі. ЧС па эндурансе.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 9.50, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Шчаслівыя ў разводзе».
**6.45** Камедыя «Неўпапад».
**8.20** Камедыя «Таксі 2».
**10.35** Камедыя «Блізнюк».
**12.25** Камедыя «Матулі».
**14.00, 22.50, 0.55, 2.55, 5.40** Скетчком «Паміж намі».
**14.20** Камедыя «Паўднёвыя моры».
**16.00** Камедыя «Дзіўныя сваякі».
**18.20** Камедыя «Любовь-морковь».
**20.20** Камедыя «Правадыр разнаскурых».
**23.10** Камедыя «Здзелка».
**1.15** Камедыя «Джым з Пікадзілі».
**4.00** Меладрама «Даю год».

### ТБЗ

**6.00** М/ф.
**9.35, 5.15** «Нераскрытыя тайны».
**10.30** «Procіно».
**10.40** «Хронікі маскоўскага побыту».
**11.30** «Гісторыі выратавання».
**12.05, 0.20** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял
**16.10** «Звярыны атрад». М/ф.
**17.25, 3.55** «Генадзь Хазанаў. Пяць граняў поспеху». Дак. фільм.
**19.10** «Лёс Марыі». Маст. фільм.
**21.00** «Схаваная пагроза». Маст. фільм.
**22.50** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ТБ1000

**6.00** Фантастыка «Місія «Серэніці».
**8.00** Камедыя «Аналізуй тое».
**10.00** Камедыя «Каляды з няўдачнікамі».
**12.00** Драма «Самы блізкі сябар».
**14.00** Трагікамедыя «Кірмаш ганарыстасці».
**16.20** Трылер «Ілюзія падману».
**18.20** Камедыя «Квартэт».
**20.00** Драма «Філамена».
**21.40** Меладрама «А вось і Полі!».
**23.10** Драма «Выжывуць толькі палюбоўнікі».
**1.30** Камедыя «Кухар на колах».
**4.00** Камедыя «10 крокаў да поспеху».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**8.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**9.45** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**11.15** Драма «Гутарка».
**12.40** Камедыя «Нерэальнае каханне».
**14.10** Драма «Балі Валтасара, ці Ноч са Сталінам».
**15.40** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**17.20** Баявік «22 хвіліны».
**18.50** Баявік «Васьмёрка».
**20.20** Драма «Адна вайна».
**21.50** Трылер «Уцекачы».
**23.25** Меладрама «Маша і мора».
**1.05** Драма «Клас карэкцыі».
**2.40, 4.30** Драма «Злачынства і пакаранне».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00, 8.00** Гульні розуму.
**6.50** Навуковыя недарэчнасці.
**7.15, 8.40** Узлом сістэмы.
**7.40** Код небяспекі.
**9.20** Золата Юкана.
**10.10** Сканеры старажытнага свету.
**11.00** Навука будучага Стывена Хокінга.
**11.50** Космас: прастора і час.
**12.40** Мегазаводы.
**13.30** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
| **Информация о земельном участке и ограничение по его использованию** | кадастровый номер 425483307102000326 площадью 0,3534 га, весь земельный участок расположен в водоохранных зонах водных объектов | кадастровый номер 425483307102000025 площадью 2,7094 га, весь земельный участок расположен в водоохранных зонах водных объектов | кадастровый номер 425483307102000026 площадью 0,0882 га |
| **Местонахождение имущества: Гродненская обл, Слонимский р-н, Озгиновичский с/с, д. Чемеры, ул. Грибовская** | | Начальная цена: **3 441 252 600 рублей с учетом НДС** | Сумма задатка (5%): **172 062 630 рублей** |

**Сведения о продавце:** ОАО «Слонимский агросервис», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Строителей, 8, тел. 8(01562)6 26 11.

**Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка:** Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906.

**Срок заключения договора купли-продажи**: в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов.

**Условия оплаты**: определяются по согласованию сторон.

**СРОК ПОДАЧИ ДОКУМЕНТОВ**: **по 28 сентября 2015 г. включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8.**

**Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by.**

**Предыдущие публикации:** газета «Звязда» от 17.04.2015 г., 23.06.2015 г., 06.08.2015 г.

Дополнительная информация: **8(0152) 74 49 11, 77 23 79.**

## Извещение о проведении 13 октября 2015 г. аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – МОТЫКАЛЬСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ БРЕСТСКОГО РАЙОНА БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ

| № лота | Местоположение земельного участка и кадастровый номер земельного участка | Характеристика участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации и регистрацию земельного участка (руб.) | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская обл., Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, ул. Виноградная, 3 № 121283001601000755 | Земельный участок площадью 0,1323 проходит газопровод, линия электропередачи, подъезд к участку будет осуществляться по существующей уличной сети | 0,1323 | 100 000 000 | 10 000 000 | 10 533 021 рубль + (возмещение расходов на объявления в СМИ о проведении аукциона согласно акту выполненных работ) | Строительство и обслуживание жилого дома |
| **Аукцион будет проводиться 13 октября 2015 г. в 10.00 по адресу: Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома)** | | | | | | | |

**Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, подать заявление об участии в аукционе.**

**К заявлению прилагают:**

- документ (паспорт), удостоверяющий личность покупателя;
- копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Мотыкальского сельисполкома № 3604000001918 в филиале 100 ОАО «АСБ Беларусбанк» код 246, г. Брест, УНП 200177486 суммы с пометкой «Задаток за земельный участок», сумма задатка в размере 10% от начальной цены земельного участка.

Заявление на участие в аукционе принимаются по адресу: **Брестский район, аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням.**

**Последний срок подачи заявления – 08.10.2015 года до 17.00.**

Контактные телефоны**: 8 (0162) 94-91-35, 8 (029) 761-92-84.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «РАДИОВОЛНА»

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | |
| **Предмет торгов, краткая характеристика, местонахождение** | Изолированное помещение с инв. № 400/D-89156 общей площадью 3461,1 кв.м, находится в кирпичном капитальном строении 1983 г.п., расположенное на земельном участке с кадастровым номером 440100000002004442 по адресу: г. Гродно, ул. М. Горького, 89. Сдаются в аренду: помещение 398.1 кв.м – срок аренды по 01.11.2015 г., помещение 74 кв.м – срок аренды по 01.12.2015 г. | | |
| **Начальная цена** | **11 922 979 344 рубля с учетом НДС** | **Сумма задатка (5%)** | **596 148 970 рублей** |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Радиоволна», г. Гродно, ул. М.Горького, 89, тел. 8(0152) 437272 | | |
| **Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 14 октября 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | по 8 октября 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно ул. Мицкевича, 8 | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона на сайте www.fincentr.by, телефоны для справок: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11** | | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже в частную собственность гражданам Республики Беларусь земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

**Организатор аукциона – Валевачский сельский исполнительный комитет**

| Местоположение объекта аукциона, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наименование инженерных сетей | Начальная цена объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Также подлежат возмещению |
|---|---|---|---|---|---|
| Участок № 1 РБ, Минская обл., Червенский р-н, Валевачский с/с, д. Запасенье, ул. Луговая, 34, кадастровый номер 625880804601000066 | 0,1500 | Электроснабжение | 18 500 000 | 1 850 000 | Затраты на оформление и регистрацию участка, расходы по размещению извещения в СМИ |
| Участок № 2 РБ, Минская обл., Червенский р-н, Валевачский с/с, д. Запасенье, ул. Луговая, 36, кадастровый номер 625880804601000067 | 0,1500 | Электроснабжение | 18 500 000 | 1 850 000 | Затраты на оформление и регистрацию участка, расходы по размещению извещения в СМИ |
| Участок № 3 РБ, Минская обл., Червенский р-н, Валевачский с/с, д. Погулянка, ул. Центральная, 9, кадастровый номер 625880809101000046 | 0,1500 | Электроснабжение | 28 000 000 | 2 800 000 | Затраты на оформление и регистрацию участка, расходы по размещению извещения в СМИ |
| Участок № 4 РБ, Минская обл., Червенский р-н, Валевачский с/с, д. Кривополье, ул. Лесная, 39, кадастровый номер 625880808101000085 | 0,1496 | Электроснабжение | 24 000 000 | 2 400 000 | Затраты на оформление и регистрацию участка, расходы по размещению извещения в СМИ |

1. **Аукцион состоится 13 октября 2015 года в здании сельского исполнительного комитета по адресу: Минская область, Червенский район, аг. Валевачи, ул. Минская, 15. Начало аукциона в 12.00.**

2. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка составляет 5%.

3. Для участия в аукционе граждане предоставляют в комиссию по проведению аукционов заявление; копию заверенного банком платежного документа о внесении задатка; документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица; доверенность, удостоверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

4. *Сумма задатка перечисляется в срок до 10 октября 2015 года на счет 3600632022731 Валевачского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 627 филиала № 500 – МУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Червень, МФО 153001601, УНП 600537220, назначение платежа 04901.*

5. Заявления на участие в аукционе принимаются с момента размещения извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации. Время работы в будние дни 08.00–13.00 и 14.00–17.00, в субботу 08.00–13.00 по адресу: Минская область, Червенский район, аг. Валевачи, ул. Минская, 15, сельсовет.

Прием заявлений заканчивается **10 октября 2015 года в 17.00.**

**Контактные телефоны: (8-01714) 47 352, 47 319, 24 072, (МТС) 8 029 863 44 09.**

## Технический администратор доменных зон .БЕЛ и .BY УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ»

**сообщает о проведении благотворительных аукционов на регистрацию доменных имен из сформированных списков доменных имен для приоритетной регистрации по итогам благотворительных аукционов, а также доменных имен, исключенных из реестра.**

**Средства от аукциона, кроме стоимости услуг по регистрации доменного имени и налогов, будут перечислены на нужды детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей.**

Предметом аукциона являются доменные имена в доменных зонах .БЕЛ и .BY из сформированных списков доменных имен для приоритетной регистрации по итогам благотворительных аукционов, а также доменные имена, исключенные из реестра. Перечень доменных имен, предлагаемых к регистрации по результатам аукциона, размещается на сайте https://auction.cctld.by.

Даты проведения аукционов в период с октября по декабрь 2015 г.:

**Дата начала аукциона доменов .BY – 12 октября 2015 г., дата окончания аукциона – 14 октября 2015 г.**

**Дата начала аукциона доменов .БЕЛ – 20 октября 2015 г., дата окончания аукциона – 22 октября 2015 г.**

**Дата начала аукциона доменов .BY – 04 ноября 2015 г., дата окончания аукциона – 06 ноября 2015 г.**

**Дата начала аукциона доменов .БЕЛ – 16 ноября 2015 г., дата окончания аукциона – 18 ноября 2015 г.**

**Дата начала аукциона доменов .BY – 02 декабря 2015 г., дата окончания аукциона – 04 декабря 2015 г.**

**Дата начала аукциона доменов .БЕЛ – 14 декабря 2015 г., дата окончания аукциона – 16 декабря 2015 г.**

Время начала аукциона – 12.00 часов даты начала аукциона, время окончания аукциона – 12.00 часов даты окончания аукциона. В случае, если в течение последних 2 минут до окончания аукциона была сделана ставка, срок проведения аукциона автоматически продлевается еще на 5 минут.

Аукцион проводится на интернет-ресурсе https://auction.cctld.by.

В отношении каждого доменного имени, являющегося предметом аукциона, размещается программная форма, позволяющая участникам аукциона делать ставки.

Участниками аукциона могут быть юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, являющиеся резидентами или нерезидентами Республики Беларусь. Для участия в аукционе участник должен пройти регистрацию на сайте https://auction.cctld.by

Начальная цена предмета аукциона доменов .БЕЛ составляет 450 000 белорусских рублей, доменов .BY – 300 000 белорусских рублей. Шаг аукциона – 50 000 белорусских рублей.

Прием ставок прекращается по истечении 2 календарных дней после начала аукциона по каждому доменному имени.

Аукцион считается состоявшимся при наличии хотя бы одной ставки.

Победившим в аукционе считается тот участник, который сделал максимальную ставку к моменту окончания аукциона.

Текст Положения о порядке проведения аукциона на регистрацию доменных имен, находится на сайте https://auction.cctld.by в разделе «Правила проведения аукционов».

**Организатор аукциона: УП «НАДЕЖНЫЕ ПРОГРАММЫ», УНП 100160363, e-mail: au@hoster.by**

**Тел. организатора +375 17 239 57 02.**

**Тел. комиссии по организации и проведению аукциона +375 17 239 57 77.**

## ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

# «СА «ЗВЯЗДОЮ» — СПАДРУЧНЕЙ!

**I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

1. Рэкламная гульня пад назвай «Са «Звяздою» — спадручней!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 12 верасня па 31 снежня 2015 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал 2015 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

**II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ**

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ (руб.) | Усяго з ПДВ (руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Прас Bosch TDA2315, РФ | 7 | 511 000 | 3 577 000 |
| 2. | Пральная машына LG F10C3LD, РФ | 1 | 4 599 000 | 4 599 000 |

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» складае 8 176 000 (восем мільёнаў сто семдзесят шэсць тысяч) беларускіх рублёў.

**III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ**

4. Рэкламная гульня «Са «Звяздою» — спадручней!» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал 2015 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал ці другое паўгоддзе 2015 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 12 верасня па 14 кастрычніка 2015 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 12 верасня па 11 кастрычніка 2015 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які дасылаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, скапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 14 кастрычніка 2015 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

**IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ**

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчыца аддзела падпіскі і рэалізацыі рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

**V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ**

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 15 кастрычніка 2015 года а 12 гадзіне ў памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным прасе.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — пральная машына.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 25 кастрычніка 2015 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 25 кастрычніка 2015 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

**VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ**

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 4 квартал або другое паўгоддзе 2015 года.

Пры звароце па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 4 квартал або другое паўгоддзе 2015 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 4 квартал або другое паўгоддзе 2015 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2015 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2015 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

**VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, прадугледжаных дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, звязаных з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Са «Звяздою» — спадручней!» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 284 44 04.

Шукайце картку ўдзельніка Гульні ў найбліжэйшых нумарах газеты!

*Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні №2619 ад 03.09.2015 г. выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.*

■ Неасабісты суб'ектыў

# ГАЛАВА І ДВА КОЛЫ



## ПРА СРОДАК ПЕРАМЯШЧЭННЯ, ЯКІ НЕ ЛІЧЫМ ТРАНСПАРТАМ. А ДАРЭМНА...

Мой першы «дарослы» веласіпед — чырвоны «Аист» з аранжавымі катафотамі на колах — дагэтуль стаіць недзе ў паветцы. Ездзіць на ім ужо даўно няма як: за амаль трыццаць гадоў цэлай засталася хіба што рама, але здаць на металалом ці проста вывезці на сметнік рука не падымаецца. Бо гэта не проста напамін пра шчаслівае вясковае маленства — гэта сапраўдны стары сябар, з якім, як толькі сыходзіў снег, амаль не расставаліся, які часта выручаў і дапамагаў. А сяброў, нават калі яны ўжо нямоглыя, не кідаюць.

Ён сапраўды ў вёсцы быў незаменным. Колькі на ровары было езджана-пераезджана: і ў школу, што была ў суседняй вёсцы, і на возера, і на сенакос, які ў саўгасе выдзялялі ў далёкіх урочышчах, так што калі б пешшу, дык паўдня б траціў, каб дайсці туды і назад. І нават на дыскатэку за восем кіламетраў ад дому — на цэнтральную сядзібу саўгаса. Прыехаў, паставіў веласіпед у двары ў знаёмых, крыху пачысціўся ад пылу — і танчы сабе на здароўе. Пасля ўскочыў на ровар — і за паўгадзіны дома. Дзякуючы менавіта гэтаму транспартнаму сродку мы, вясковыя падлеткі, маглі зразумець і адчуць Радзіму — не тую вялікую і магутную, якую вучылі любіць у школе, а тую, што побач, з якой вялікая і магутная пачынаецца. Гойсаючы на веласіпедах па трохкутніку Волма — Ракаў — Івянец (а адлегласці паміж гэтымі мястэчкамі немалыя — у сярэднім пад дваццаць кіламетраў, пешшу не абыдзеш), мы спыняліся і як зачараваныя глядзелі на высозныя сосны на пясчаных кручах на берагах Іслачы, на лебедзяў, якія спакойна плавалі ля стромкага касцёла, што адлюстроўваўся ў вадзе, радасна віталіся са знаёмымі і незнаёмымі дзядзькамі і цёткамі, якія вярталіся на падводах з кірмашоў... Чырвоны ровар быў магчымасцю жыць хутчэй і напоўніцу, з ім было весялей і спрытней.

А яшчэ ён заўсёды ўспрымаўся як сапраўдны транспарт. І для старэйшых, і для малодшых у вёсцы, дзе веласіпед быў самым папулярным сродкам перамяшчэння, гэта было (дый сёння, ведаю, застаецца) законам. Ехаць па ўскрайку праезнай часткі, прытармозваць на скрыжаваннях, мець на роварах элементы, што будуць свяціцца ў прыцемку, не імчаць ва ўвесь дух па вясковай вуліцы, бо пад колы можа нечакана выскачыць кураня, кацяня, дзіця, а то і не вельмі цвярозы аднавясковец... Правілы выконвалі без пытанняў, бо добра разумелі цану іх парушэння — пакалечыць іншых, пакалечыцца сам. І гэтага было дастаткова, каб у тым адчайным бесклапотным дзяцінстве не здарылася нічога сур'ёзна-балючага (хаця былі і падраныя сукенкі, і разбітыя калені), а стары веласіпед пакінуў толькі цёплыя ўспаміны і прыемныя асацыяцыі.

Пра ўсё гэта я думаю ледзь не штодня, калі на Каменнай Горцы выходжу з тралейбуса і іду да станцыі метро. На нядаўна пакладзеным шырокім тратуары праведзена раздзяляльная лінія, намаляваны знакі: вось гэта частка — для пешаходаў, гэта — для веласіпедыстаў. Для большасці пешаходаў яны нічога не абазначаюць — народ ідзе, як яму зручна. Для веласіпедыстаў, якіх становіцца ўсё больш, — гэта паласа перадолення: яны (праўда, не ўсе) і рады б ехаць па сваёй частцы, але пешаходы паўсюль і саступаць не збіраюцца. Таму рупліўцы экалогіі і здаровага ладу жыцця вымушаны лавіраваць паміж «гаспадарамі тратуара», якія выказваюць абурэнне, а асаблівa нервовыя могуць яшчэ і штурхнуць няшчаснага веласіпедыста ў спіну. І для адных, і для другіх сумесны шлях атрымліваецца экстрэмальным, з пагрозай для здароўя і нават жыцця. Хаця месца хапае ўсім. Парадокс? Хутчэй, пытанне менталітэту.

Зразумела, да любой новай з'явы трэба прывыкнуць. Ведаю па ўласным досведзе: падчас першых паездак у Берлін, дзе веласіпедыстаў не нашмат менш, чым аўтамабілістаў, сябры літаральна сілай сцягвалі мяне з той часткі тратуара, на якой намаляваны веласіпед. Бо там кіроўца ровара на сваёй палове адчувае сябе паўнапраўным гаспадаром, ён не будзе збочваць, а проста паедзе на цябе і тваё самаадчуванне ў такім выпадку — справа выключна тваёй уласнай спрыту... Цяпер ісці па «сваёй» палове стала для мяне абавязковым правілам. У Берліне, у Мінску, дзесьці яшчэ — няважна. Насамрэч, нічога новага. Проста ўспомніла вядомае з дзяцінства: транспарт (хоць і на двух колах) — усё роўна транспарт. З пэўнымі патрабаваннямі і да яго ўласніка, і да тых, хто рухаецца з ім па адной дарозе. Вось гэтага разумення большасці з нас — і тым, хто на нагах, і тым, хто на тых самых двух колах, — пакуль не хапае. А веласіпедаў і веласіпедыстаў становіцца ўсё больш.

Лічыце, праблема надуманая? Мой знаёмы, які паўгода лячыў ключыцу, зламаную пасля сутыкнення з веласіпедыстам на сталічным праспекце, з лёгкасцю дакажа вам адваротнае. Мужчына, які на пачатку лета трапіў пад веласіпед у Гродне, на жаль, у гэтай дыскусіі не паўдзельнічае: ад атрыманых траўм ён у той жа дзень памёр.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

■


Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС № 4426326 **считать недействительным.**

УНП 100122726

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,**

**опубликованной в газете «Звязда» 26.01.2013 г. №16, строительства 20-этажного односекционного жилого дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – ул. Оршанская – ул. Орловская – ул. Сморговский тракт г. Минск:**

«...Стоимость 1 кв.м квартир общей площадью **117,4** кв.м на 17-м этаже составляет **1050** (одна тысяча пятьдесят) **долларов США,** общей площадью 45,44 кв.м на 7-м этаже составляет **1250** (одна тысяча двести пятьдесят) **долларов США,** 5 машино-мест по **15 000** (пятнадцать тысяч) **долларов США** за место для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90, пн-пт (9.00–18.00, обед 13.00–14.00).**

УНП 101019973

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ИООО «Датч Стар»,**

**опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр-т Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартиры площадью **40,68 кв.м**, на 16-м этаже – 1150 (одна тысяча сто пятьдесят) долларов США, общей площадью **40,68 кв.м,** на 8-м этаже – 1200 (одна тысяча двести) долларов США, общей площадью **89,84 кв.м** на 8-м этаже, **83,08 кв.м** на 10 этаже, **66,9 кв.м** на 10-м этаже – 1300 (одна тысяча триста) долларов США».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел.: 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В СОБСТВЕННОСТИ УЗ «ВОЛКОВЫССКАЯ ЦРБ»

УНН 500007288

| Лот № 3 | | | |
|---|---|---|---|
| **Предмет аукциона** | **Комплекс зданий, сооружений, инженерных сетей поликлиники** | | |
| **Местонахождение имущества** | Гродненская обл., г. Волковыск, ул. Мицкевича, 37, 37/1 | | |
| **Информация о земельном участке** | Площадь земельного участка 0,1038 га (под застройкой). Срок аренды – по 12 апреля 2065 г. | | |
| **Начальная цена предмета аукциона** | 316 556 843 рубля | **Размер задатка** | 32 000 000 рублей |
| **Продавец имущества** | УЗ «Волковысская центральная районная больница», тел.: 8 (01512) 4 12 03, 4 12 98 | | |
| **Аукцион состоится 30 сентября 2015 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39** | | | |
| **Сведения об организаторе торгов** | Фонд «Гроднооблимущество», г. Гродно, ул. 17 сентября, 39, тел. 8 (0152) 77 29 15 | | |
| **Срок подачи документов** | По 24 сентября 2015 года до 12.00 | | |
| **Условия использования недвижимого имущества** | Вовлечение в хозяйственный оборот в течение 3 лет с момента заключения договора купли-продажи | | |

УНП 101015738

**РУП «Белпочта»**

**ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРЕГОВОРОВ ПО ВЫБОРУ ПОДРЯДНОЙ ОРГАНИЗАЦИИ**

**для выполнения проектно-изыскательских работ по объекту**

**«Капитальный ремонт смотровых ям, расположенных в здании авторемонтной мастерской автотранспортного производства РУП «Белпочта» по ул. Лукьяновича, 6/2 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится «15» **сентября 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.**

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел.: 293-55-29, 293-55-28.

УНП 500021638

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ**

**ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»**

**21 сентября 2015 года состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская 70**

**Повестка дня собрания:**

1. Об утверждении передаточного акта.
2. Об утверждении договора о присоединении УПП «НОМ-Лидсельмаш» к ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш».
3. Об утверждении дополнения и изменений в Устав Общества.

***Наблюдательный совет ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»***

## Шляхам веры і духоўнасці

**Многія сотні кіламетраў за пяць вераснёўскіх дзён прайшлі-праехалі ўдзельнікі экспедыцыі «Дарога да Святыняў». Назва ёй дадзена прыгожая і абавязваючая: «Міжнародная навукова-асветніцкая» — такі галоўны вектар працы ўдзельнікаў гэтага ўнікальнага паломніцтва па буйных гарадах і маленькіх вёсках краіны. Усюды мы зноў і зноў пераконваліся, што менавіта наша багатая духоўная спадчына дапамагае сёння рухацца наперад і навукоўцам, і асветнікам. Усё, што мы звыкла называем радзінным з часам ператвараецца ў галоўнае багацце Радзімы, а з нашых будзённых спраў і ўчынкаў, як з маленькіх штрыхоў, узнікае наш абагульнены партрэт.**

# Партрэт ля сцежкі да храма




*Не для сябе, не дзеля пахвалы —*
*Для тых,*
*хто крочыць зблізку і здалёк,*
*Яна ткала сцяжынку да царквы —*
*Нібы да мора светлы ручаёк.*

*Не для сябе старалася саткаць*
*Чырвонай ніткай, колерам любві,*
*І чорнай ніткай —*
*каб не забываць,*
*Што ёсць канец у сцежак на зямлі...*

*Вось так жывём і пакідаем след*
*На ціхіх сцежках, бальшаках ліхіх,*
*Каб хтосьці*
*потым разгадаў сакрэт,*
*Адкуль бяруць пачатак ўсе шляхі.*





Вёска Новы Двор Свіслацкага раёна сустракала экспедыцыю сярод пахмурнага дня. Але вакол царквы, падавалася, было сонечна ад светлых жаночых хустачак, стракатага адзення дзятвы. Сустракала прыехаўшых, лічы, уся вёска, таму размоў тут было шмат і, адпаведна, кожны ўдзельнік экспедыцыі даведаўся шмат цікавага. Напрыклад, народная артыстка Беларусі Марыя Захарэвіч пагутарыла з вясковымі спявачкамі. Тыя — прызнаныя таленты: у навадворскай царкве захоўваюцца ганаровыя дыпломы, атрыманыя мясцовымі выканаўцамі на фестывалях праваслаўных спеваў. Радыёжурналіст Людміла Мітаковіч занатоўвала для сваіх духоўна-асветніцкіх перадач звесткі пра даўніну. Заслужаны работнік адукацыі Елізавета Мукасей цікавілася справамі вясковай школы. Шмат чаго прыкмеціў для свайго дзённіка пісьменнік Анатоль Бутэвіч. Гэта ён спрактыкаваным вокам гісторыка і знаўца народнага мастацтва заўважыў у цені царкоўных сцен незвычайную тканую харугву, створаную калісьці невядомым мясцовым майстрам. Айцец настаяцель растлумачыў нам, што гэтая харугва, як і некаторыя выразаныя з дрэва ўпрыгажэнні, перанесены ў новы будынак царквы са старога, якога, на жаль, ужо не існуе.

Але жывуць нашчадкі майстроў. Ад царкоўнай брамы да прыступак храма, абкладзеная жывымі кветкамі, працягнулася шматметровая пунсовая тканая сцяжынка. Зрабіла і ўпрыгожыла арнаментам гэты цуд рукадзелля прыхаджанка Ірына Горбач. Сцяжынка да царквы — адзін з твораў майстрыхі, на якія яе натхніе вера.

Фота майстрыхі я прапаную чытачам разам са здымкамі ўнікальнай драўлянай разьбы і тканай харугвы, а таксама вершам, які напісаў пад уражаннем ад гэтай сустрэчы.

**Яўген ПЯСЕЦКІ**

## Даты Падзеі Людзі

**11 ВЕРАСНЯ**

**1877** год — нарадзіўся (маёнтак Дзяржынава Ашмянскага павета Віленскай губерні, цяпер Валожынскі раён) Фелікс Дзяржынскі — савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, рэвалюцыянер, заснавальнік УНК. Ён лічыў, што для барацьбы з контррэвалюцыяй падыходзяць любыя сродкі, нават самыя жорсткія. «НК — не суд, НК — абарона рэвалюцыі. НК павінна абараняць рэвалюцыю і перамагаць ворага, нават калі меч яе пры гэтым выпадкова закране галовы нявінных», — казаў «жалезны» Фелікс. У 1921 годзе ён быў прызначаны наркамам шляхоў зносін, адначасова з'яўляўся старшынёй камісіі «па паляпшэнні жыцця дзяцей». У лютым 1924-га Дзяржынскі становіцца старшынёй ВСНГ СССР. На сваёй пасадзе ён імкнуўся стварыць трывалую базу народнай гаспадаркі праз развіццё дабрабыту вёскі і дробнага прыватнага гандлю. Лічыў неабходным знізіць сабекошт прадукцыі і цэны на вырабы прамысловасці шляхам павелічэння прадукцыйнасці працы. У канцы жыцця Фелікс Эдмундавіч выказваў думкі аб неабходнасці змяніць структуру дзяржаўнага апарату, каб пазбегнуць у далейшым засяроджання ўлады ў адных руках. На жаль, яго тады ніхто не паслухаў. 20 ліпеня 1926 года Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі выступіў з рэзкай прамовай на пленуме ЦК, прысвечаный стану эканомікі краіны. У той жа дзень з прычыны нервовага зрыву яму стала дрэнна, і ён памёр у Маскве ад сардэчнага прыступу.



**1890** год — 115 гадоў таму нарадзіўся (вёска Старына Ігуменскага павета, цяпер Чэрвеньскі раён) Мікалай Васільевіч Шатэрнік, вядомы беларускі мовазнавец, аўтар «Краёвага слоўніка Чэрвеншчыны», актыўны ўдзельнік беларускага адраджэння ў 20-х гадах мінулага стагоддзя. У 1914—1929 гадах настаўнічаў на Міншчыне, у 1933—1934 гадах выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Аршанскім педагагічным тэхнікуме. Аўтар артыкулаў па пытаннях педагогікі і методыкі. Памёр у 1934 годзе.

**1945** год — 70 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Мікалаевіч Рыжанкоў, беларускі грамадскі дзеяч, педагог, заслужаны трэнер Беларусі (1988), заслужаны работнік фізічнай культуры і спорту Беларусі (1992). Працаваў інструктарам, загадчыкам сектара фізічнай культуры і спорту ЦК КПБ, старшынёй Дзяржкамспорту Беларусі, узначальвай Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі. У 1995—1996 гадах — міністр спорту і турызму Рэспублікі Беларусь. Памёр у 1996 годзе.

### Было сказана

**Паўлюк ТРУС, паэт:**

*Там, дзе ў бурах*
*Сыпалася зерне,*
*Бур'янам дзікім*
*Шлях не зарасце.*

## Факт

### У ЛЕСАВОДАЎ — СВОЙ ГІМН

**Сёлета сваё прафесійнае свята работнікі лесу будуць сустракаць з уласным гімнам.**

Адкрыты конкурс на стварэнне тэксту і музыкі галоўнага песеннага твора галіны быў абвешчаны яшчэ ў мінулым годзе. Да канца красавіка сёлетняга ў аргкамітэт паступіла 30 работ. Для фінальнага этапу камісіяй па арганізацыі і правядзенні конкурсу былі адабраны чатыры праекты гімна, якія былі разасланы ў арганізацыі лясной гаспадаркі для галасавання.

Пасля абмеркавання аўтарытэтнае журы, у склад якога ўвайшлі кіраўнікі галіны, абласных лесагаспадарчых аб'яднанняў і прафсаюзаў работнікаў лесу, з улікам галасоў на месцах выбрала два праекты. Па выніках фінальнага галасавання большасцю галасоў пераможцам стаў «Гімн лесаводаў» на словы Анатоля Зэкава і музыку Леаніда Шурмана. Ён пачынаецца такімі словамі: «Жыццё ідзе, жыццё бяжыць, // Ляціць наперад без аглядкі. // Сыходзім мы, а лесу жыць // І вабіць хараством нашчадкаў...»

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.34 | 19.37 | 13.03 |
| Віцебск — | 6.23 | 19.28 | 13.05 |
| Магілёў — | 6.25 | 19.27 | 13.02 |
| Гомель — | 6.23 | 19.22 | 12.59 |
| Гродна — | 6.50 | 19.52 | 13.02 |
| Брэст — | 6.52 | 19.51 | 12.59 |

## Месяц

*Маладзік 13 верасня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

**Пр.** АДСЯЧЭННЕ ГАЛАВЫ ІААНА ПРАДЦЕЧЫ.
**К.** Прота, Пятра, Фелікса, Яна, Яцка.



Фота Лены ДАРАШКЕВІЧ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Я — беспрацоўны, сяджу дома, але ўсё роўна даміную ў сям'і. Сёння так на жонку накрычаў, каб яна купіла мне новыя губкі для мыцця посуду.**

Пры прыёме на працу.
— Апішыце ступень сваёй адэкватнасці.
— Я не раблю сэлфі.
— Вы прыняты!




caricatura.ru

**Самастойная зборка мэблі, паклейка шпалер і рамонт увогуле — гэта працэс, калі муж даведваецца, што ніякі ён не «Любы», «Дарагі» і «Заяц», а «дурань бязрукі».**

Дыялог у сталовай:
— Што вам?
— Пюрэ і свініну.
— Цыбуляй пасыпаць?
— А гэта бясплатна?
— А вам дакладна свініну можна?

**Вельмі сумленны прадавец фальшывых дыпломаў пры продажы задае пакупніку некалькі дадатковых пытанняў па спецыяльнасці.**

— Сёння на працы павышэнне атрымаў.
— І хто ты цяпер?
— Цяпер я на другім паверсе працую.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.022. Індэкс 63850. Зак. № 3647.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 10 верасня 2015 года.